

У аграгарадку Верамейкі Чэрыкаўскага раёна заатэхнік на пенсіі будуе на двары дома яхту, а яго жонка распісвае матрошак і піша вершы. Ларыса Мікалаеўна і Юрый Васільевіч Кальмаевы — творчая сям'я. СТАР. 3



Эксперты лічаць, што калі дзяржаўнае здымнае жыллё будзе ўзводзіцца ў дастатковай колькасці, а здавацца па больш нізкай цане, то кошт арэнднай платы ў прыватнікаў таксама папаўзе ўніз. СТАР. 4



Беларусь гандлюе з вялікай колькасцю краін. Аднак ад праблем геаграфія не страхуе. Чаго не хапае беларускім аўтаперавозчыкам для яшчэ больш эфектыўнай працы? Чаму многія машыны вяртаюцца на радзіму паражняком? СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 мая 2013 г. СЕРАДА № 96 (27461) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## РАБОЧЫ ВІЗІТ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ Ў КАЗАХСТАН

**Плануецца, што ў Астане кіраўнік беларускай дзяржавы прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, на якім будуць абмеркаваны перспектывы развіцця асноўных напрамкаў інтэграцыі.**

На пасяджэнні, у прыватнасці, плануецца разгледзець праект Дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. Чакаецца, што бакі таксама абмяркуюць мерапрыемствы па стварэнні інтэграванай інфармацыйнай сістэмы знешняга і ўзаемнага гандлю Мытнага саюза, правядзенне ўзгодненай аграпрамысловай палітыкі, асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі дзяржаў — членаў МС і АЭП на 2013-2014 гады.

**БЕЛТА.**

■ Ва Урадзе

## КАНКРЭТНАЯ РАБОТА ДАСЦЬ МАКСІМАЛЬНЫЯ ВЫНІКІ

**Пад старшынствам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў. Галоўныя пытанні парадку дня — узмацненне кантролю за тарыфамі на жыллёва-камунальныя паслугі і недапушчэнне зрыву тэрмінаў уводу аб'ектаў у эксплуатацыю.**

Кіраўнік урада нагадаў аб тым, што ў галіну паступаюць вялікія аб'ёмы субсідый. Штогод гэта мінімум Br6 трлн. Разам з тым матэрыялы Камітэта дзяржкантролю, падрыхтаваныя ў мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы, сведчаць аб тым, што ў некаторых арганізацыях так званыя планавыя тарыфы, якія даводзяцца, у 4-5 разоў перавышаюць усе разумныя межы. «Такім чынам, паважаныя старшыні аблвыканкамаў, вашы гарадскія і раённыя выканкамы зусім не кантралююць разам з фінансавымі інстытутамі абласцей, гарадоў і раёнаў тарыфную палітыку на паслугі ЖКГ», — заявіў Міхаіл Мясніковіч.

Ён даў даручэнне па вырашэнні гэтага пытання. Гэта тэма ўзята на кантроль урада. «Калі не дойдзем да кожнага райвыканкама, калі гэта не будзе адпаведным парадкам дня ў кожным райвыканкаме, нічога канкрэтна не атрымаецца», — канстатаваў прэм'ер-міністр.

Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч заявіў, што будаўнічыя арганізацыі, якія дапусцілі зрыў тэрмінаў уводу аб'ектаў у эксплуатацыю, будуць несці матэрыяльную адказнасць. Аналізуючы вынікі праведзенай работы па гэтым плане ў галінах і міністэрствах, прэм'ер-міністр адзначыў, што асаблівую трывогу выклікае сфера будаўніцтва. СТАР. 2

■ Абітурыент-2013

Аляксандр ЖУК:

## «Прыватныя ВНУ зрабілі ўпор на найменш затратныя спецыяльнасці»



Фота БЕЛТА.

**«Зладжаныя дзеянні калектываў прыёмных камісій, адказнае стаўленне да работы, граматнае прымяненне нарматыўнай базы, дакладнасць і акуратнасць, уменне лагічна падыходзіць да вырашэння неардынарных сітуацый і добразычлівае стаўленне да людзей — усё гэта павінна стаць эталонам дзеяння кожнага кіраўніка, кожнага адказнага сакратара і кожнага работніка прыёмнай камісіі, — заявіў на нарадзе адказных сакратароў прыёмных камісій першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук. — З аднаго боку, уступная кампанія мае дзяржаўнае значэнне, паколькі закранае лёсы дзясяткаў тысяч маладых людзей. А з другога, характарызуе арганізацыю дзейнасці ўстаноў адукацыі па папаўненні кантынгенту навучэнцаў. Дзякуючы шматгадовай сумеснай працы Дзяржаўнай камісіі, Камітэта дзяржкантролю, Міністэрства адукацыі і іншых органаў дзяржкіравання ў краіне выпрацавана дастаткова эфектыўная і стабільная сістэма арганізацыі прыёму ва ўстановы вышэйшай адукацыі, якая дазваляе стварыць роўныя ўмовы для рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян нашай краіны на атрыманне на конкурснай аснове вышэйшай адукацыі».** СТАР. 4

# ПЕРШЫ КРОК — У ВЯЛІКІ СПОРТ



Аднагадовы жыхар Быхава Данііл Свірыдаў з першых крокаў далучаецца да спорту. Асабліва хлопчыка прываблівае футбол.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «РАЗУМНЫ» ДОМ ЗАЛІЧЫЛІ Ў ЧЛЕНЫ СЯМ'І

**Днямі ў Дзяржынску па вуліцы Кайданоўская, 16 адбылося адкрыццё першага ў Беларусі мультыкамфортнага дома. Са сваім унікальным індывідуальным домам на ўскрайку горада карэспандэнта «Звязды» пазнаёміў яго гаспадар Аляксей ТАРНАГУРСКІ, дырэктар кампаніі «Сучасны Каркасны Дом».**

**— Зараз ваш дом пабудаваны пад чыставую апрацоўку, таму існуе магчымасць відавочна паказаць усе навінкі энергаэфектыўнай навабудоўлі?**

— Так. Нам засталося паклеіць шпалеры, месцамі давесці да ладу падлогу, установіць бытавую тэхніку і мэблю.

**— Кажуць, што гэты дом вельмі цёплы, а потым за поўнае забеспячэнне ўсёй пабудовы неабходна будзе плаціць толькі 22 долары ў месяц? Ці сапраўды сучаснае будаўніцтва можа прапанаваць эфектыўныя метады эканоміі на камунальных паслугах?**

— Праект дома заснаваны на каркаснай сістэме з драўляных бэлек павышанай трываласці. Сцены дома складаюцца з 12 слаёў сучасных будаўнічых і ацяпляльных матэрыялаў, дзе галоўны ўцяпляльнік мае таўшчыню 530 мм. Акрамя таго, увесь дом «апрануты ў футра» больш шчыльнага ўцяпляльніка, які не баіцца знешняга ўздзеяння. Гэты фасадны ўцяпляльнік абараняе ўсе канструкцыі дома ад прамярзання зімой. Менавіта дзякуючы выкарыстанню гэтых інавацыйных тэхналогій энергаспажыванне гэтага дома становіцца ў 4 разы ніжэй за існуючы стандарт.

**— Пры такой сур'ёзнай ізаляцыі самой каробкі, дом, мабыць, і не «дыхае» нават?**

— У нашым доме сцены і не павінны «дыхаць». Тут усё зроблена так, каб існаваў толькі паветраабмен, які кантралюецца за кошт прымусовай сістэмы вентыляцыі і натуральнай вентыляцыі праз мансардныя вокны. У такіх сучасных вокнах існуюць мікраклапаны, якія дазваляюць нават у дождж ажыццяўляць натуральную вентыляцыю дома.

**— У двухпавярховым доме падтрымліваць неабходныя камфортныя ўмовы стане даволі складанай справай?**

— У нашым выпадку — зусім не. У асобным пакойчыку зманціравана сістэма «разумны дом», якая будзе аўтаматычна кіраваць усімі параметрамі дома. Сюды праведзены больш як 4,5 кіламетра электраправадоў, якія пранізваюць увесь дом. Сістэма кіравання домам праз сістэму датчыкаў вымярае і кантралюе тэмпературу, асветленасць, узровень $CO_2$ і вільготнасць паветра. Кіраваць такой сістэмай можна нават дыстанцыйна па мабільнай сувязі і праз інтэрнэт.

Тут існуе гібрыдная сістэма вентыляцыі, якая прадугледжвае рэкуперацыю цяпла сустрэчных патокаў паветра. Такая сістэма рэкуперацыі цяпла беларускай вытворчасці мае каэфіцыент карыснага дзеяння больш за 92 працэнты, з-за чаго максімальна зніжаецца нагрузка на ацяпленне. СТАР. 2



ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар ЦК грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»:**

***«Разумеючы, што студэнцкія атрады з'яўляюцца адной з формаў дадатковага даходу для моладзі, варта разгледзець магчымасць прыняцця рашэння кіраўніцтвам чыгунак Беларусі і Расіі аб патаненні праезду студэнцкіх атрадаў да месцаў дыслакацыі ў летні перыяд. Мы таксама прапануем разгледзець пытанне аб магчымым падатковым паслабленні для беларускіх студэнцкіх атрадаў, якія працуюць на тэрыторыі Расіі і выплачваюць 30% падатку з фізічнай асобы, да памеру падаткаў 13%, якія выплачваюцца расійскімі будатрадамі. Дарэчы, расійскія студэнцкія атрады ў Беларусі будуць вызвалены ад выплаты падаткаў, як і беларускія».***

## ЗАМЕСТ ЗАГСА — У МУЗЕЙ!

**Віцебскі абласны краязнаўчы музей прапануе зладзіць незвычайную і запамінальную рэгістрацыю шлюбу «Вясельнае падарожжа ў музеі». Музейныя работнікі адзначаюць, што першае падарожжа маладой сям'і абыдзецца ёй нядорага.**

— «Вясельнае падарожжа ў музеі» ўключае ўрачыстую цырымонію рэгістрацыі шлюбу (сумесна з аддзеламі ЗАГС г. Віцебска), гульнявыя праграмы і віктарыны, знаёмства з вясельнымі абрадамі Віцебшчыны. А таксама гарантаваны пад'ём на вежу ратушы — сімвала старажытнага Віцебска, салют у гонар маладых, рэгістрацыю ў музейнай кнізе і шмат чаго іншага.

Цана за арганізацыю мерапрыемства прымальная: за 1 гадзіну 20 хвілін — 500 тысяч рублёў, а за 2 гадзіны — 800 тысяч рублёў. Можна зрабіць папярэдні заказ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.05.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8700,00 | ▲ |
| Еўра | 11230,00 | ■ |
| Рас. руб. | 277,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1069,19 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 21 |
| Віцебск | + 20° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 19° |

БЕЛАРУСБАНК

СКИДКИ ПРИ ОФОРМЛЕНИИ МЕЖДУНАРОДНЫХ КАРТОЧЕК ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»!

*Оформите международную карточку в Беларусбанке, и Вы будете чувствовать себя комфортно в зарубежных поездках!*

В период с 01.06.2013 по 30.09.2013 снижена стоимость обслуживания международных карточек MasterCard Gold, VISA Gold, MasterCard Standard, VISA Classic (со счетом в одной валюте):

| Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Gold, VISA Gold со сроком действия 1 год | | | |
|---|---|---|---|
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в BYR** |
| - за первый год обслуживания | 30 долларов США | 22 евро | 200 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 25 долларов США | 20 евро | 175 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 20 долларов США | 15 евро | 150 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 20 долларов США | 15 евро | 150 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Gold, VISA Gold со сроком действия 2 года** | | | |
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в BYR** |
| - за первые два года обслуживания | 45 долларов США | 30 евро | 300 000 бел. руб. |
| - за каждые последующие два года обслуживания | 30 долларов США | 22 евро | 200 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 20 долларов США | 15 евро | 150 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Standard, VISA Classic со сроком действия 1 год** | | | |
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в BYR** |
| - за первый год обслуживания | 12 долларов США | 10 евро | 75 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 10 долларов США | 7 евро | 60 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 7 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 7 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Standard, VISA Classic со сроком действия 2 года** | | | |
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в BYR** |
| - за первые два года обслуживания | 17 долларов США | 12 евро | 100 000 бел. руб. |
| - за каждые последующие два года обслуживания | 15 долларов США | 10 евро | 90 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 7 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |

**Путешествуйте легко!**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У ШВЕЦЫІ САМЫ ДАРАГІ ГАЗ У ЕЎРОПЕ



Швецыя апынулася на першым месцы ў рэйтынгу 32 краін Еўропы па цэнах на прыродны газ для насельніцтва. Там канчатковы кошт газу для спажыўцоў складае больш за 1,7 тысячы долараў за тысячу кубаметраў.

«Цікавы той факт, што шведы ўвязваюць унутраны кошт газу з коштам электраэнергіі, прычым не проста электраэнергіі, а загадзя дарагой «зялёнай» электраэнергіі. Такім чынам яны вырашаюць свае экалагічныя задачы», — заявілі даследчыкі, дадаўшы, што 46,8% электраэнергіі вырабляецца з аднаўляльных крыніц — ветру, сонца, вады. Канчатковая цана газу для спажыўцоў у Швецыі, па стане на канец 2012 года, у пераліку на долары ЗША склала каля 1,7 долара за кубаметр. Такім чынам, яна з'яўляецца самай высокай сярод 32 краін еўрапейскага кантынента. На другім месцы ў гэтым спісе апынулася Данія, жыхары якой плацяць па 1,5 долара за кубаметр. Трэцяе і чацвёртае месцы ў рэйтынгу займаюць «праблемныя» краіны еўразоны — Грэцыя (1,4 долара), а таксама Італія (1,3 долара за кубаметр).

## КІТАЙЦЫ МАРАЦЬ ПЕРАСЯЛІЦЦА НА МАРС

Тысячы кітайцаў мараць паляцець на Марс. Аднак з вялікай колькасці добраахвотнікаў выберуць толькі чатыры чалавекі. Ім і трэба будзе стаць першымі касмічнымі каланізатарамі. На чужой планеце астранаўты правядуць астатак жыцця, наладжваючы марсіянскі побыт у селішчы, загадзя пабудаваным для іх робатамі-аўтаматамі.

Па апошняй інфармацыі, заяўкі на ўдзел у амбіцыйным міжнародным праекце Mars One, палёце на Чырвоную планету ў адзін канец, падалі ўжо каля дзесяці тысяч грамадзян Кітая. У рамках праекта ў 2023 годзе на Марс адправяцца чатыры чалавекі. Першы палёт ацэнены ў шэсць мільярдаў долараў. Большую частку гэтай сумы арганізатары разлічваюць прыцягнуць праз продаж правоў на трансляцыю глабальнага рэаліці-шоу, якое пачнецца падчас адбору ўдзельнікаў. Цяпер свае відэа-заяўкі пакінула больш за 70 тысяч чалавек з усяго свету, і кітайцы тут апынуліся на другім месцы пасля жыхароў ЗША.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ШЧАСЛІВЫЯ ЛЮДЗІ ЖЫВУЦЬ У АЎСТРАЛІІ...




Аўстралія прызнана «самай шчаслівай краінай у свеце». Радавацца ёсць чаму: працягласць жыцця на Зялёным кантыненце складае ў сярэднім 82 гады, эканоміка развіваецца хуткімі тэмпамі, а беспрацоўе практычна адсутнічае.

Аўстралія займае першае месца па індэксе лепшага жыцця — better life index, складзеным Арганізацыяй эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) ужо трэці год запар. Паводле апытання АЭСР, 84% аўстралійцаў задаволены ўмовамі жыцця. Яны таксама не адчуваюць сур'ёзных праблем з беспрацоўем. Узровень занятасці ў Аўстраліі складае 73%, што на 7% вышэй за сярэдні паказчык у дзяржавах, дзе праводзілася даследаванне АЭСР. Што да здароўя нацыі, то варта адзначыць, што працягласць жыцця ў Аўстраліі складае амаль 82 гады. Гэта на два гады больш, чым у сярэднім у краінах-сябрах АЭСР. Акрамя таго, эканоміка Аўстраліі зараз актыўна развіваецца.

Пры складанні рэйтынгу «шчаслівых краін» эксперты карысталіся 11 крытэрыямі — у прыватнасці, улічвалі ўзровень даходу жыхароў, магчымасць атрымання імі адукацыі, жыллёвыя ўмовы людзей, стан іх асабістай бяспекі, аховы здароўя, задаволенасць насельніцтва жыццём, баланс паміж працоўным і вольным часам і іншае.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**31 мая 2013 года ў 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі **(вул. Чырвонаармейская, 9)** адбудзецца чарговае пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

КОРАТКА

Памер дапамог пры нараджэнні дзяцей у Беларусі за год узрос на 31,1 працэнта.

З 1 чэрвеня на 20 працэнтаў павялічваецца кошт акцызных марак, прызначаных для маркіроўкі алкагольных напіткаў і тытунёвых вырабаў. Кошт акцызнай маркі, прызначанай для маркіроўкі алкагольных напіткаў, павялічыцца з Br250 да Br300, цана акцызнай маркі, прызначанай для маркіроўкі тытунёвых вырабаў, складзе Br120 замест Br100.

З 1 чэрвеня 2013 года на 20 працэнтаў павялічыцца кошт кантрольных знакаў для маркіроўкі кавы, чаю, піва і мінералкі, алею, ноўтбукаў, маторнага масла і некаторых іншых харчовых і нехарчовых тавараў.

Аб'яўлены міжнародны конкурс на архітэктурную канцэпцыю забудовы «Мінск-Сіці». Ён прадоўжыцца па 1 кастрычніка гэтага года. У конкурсную камісію рыхтуюцца наступныя матэрыялы: генеральны і сітуацыйны планы, схема развіцця транспарту, вулічна-дарожнай сеткі, пешаходных сувязяў, разгорнуты план па забудове з розных напрамкаў, тлумачальная запіска.

*Удзельнікам ІІ Міждзяржаўнага форуму «Здароўе насельніцтва — аснова працвітання краін Садружнасці»*

**Дарагія сябры!**

Віншую з адкрыццём ІІ Міждзяржаўнага форуму «Здароўе насельніцтва — аснова працвітання краін Садружнасці».

У сучасных умовах клопат аб здароўі людзей набывае асаблівую актуальнасць. У Беларусі надаецца вялікая ўвага экалагічным пытанням, развіццю даступнай для насельніцтва медыцыны, стварэнню магутнай базы для заняткаў фізічнай культурай і спортам, шырокай прапагандзе здаровага ладу жыцця. Лічу вельмі важным аб'яднанне намаганняў у вырашэнні гэтых задач у рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Перакананы, цяперашні форум стане аўтарытэтнай дыялогавай пляцоўкай для пошуку адказаў па наспелых пытаннях, дасць шырокія магчымасці для абмену вопытам і дазволіць павысіць эфектыўнасць аховы здароўя ў краінах СНД.

Зычу вам паспяховай працы, плённага супрацоўніцтва і моцнага здароўя.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# КАНКРЭТНАЯ РАБОТА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Нягледзячы на нашы неаднаразовыя даручэнні, пытанні, звязаныя з матэрыялаёмістасцю, коштам квадратнага метра, — гэта ўсё расце», — канстатаваў ён. І з улікам таго, што шэраг будаўнічых арганізацый правальвае планавыя тэрміны ўводу аб'ектаў, што прымушае ўсё часцей звяртацца да кіраўніка дзяржавы аб прадаўжэнні тэрмінаў, павелічэнні лімітаў крэдытавання і, адпаведна, пэўных расходаў бюджэту на льгатаванне працэнтных ставак. Зрыў тэрмінаў будаўніцтва прыводзіць да сур'ёзных эканамічных наступстваў. «Гэта выліваецца ў дзясяткі мільёнаў долараў, — прадоўжыў Міхаіл Мясніковіч. — Вось ён дабрабыт людзей, вось яна беражлівасць».

У сувязі з гэтым адным з першых пунктаў рашэнняў на пасяджэнні прэм'ер-міністр даручыў упісаць механізмы матэрыяльнай адказнасці будаўнічых арганізацый за зрыў тэрмінаў уводу аб'ектаў. «Дапусцілі зрыў — павінны быць адпаведныя меры матэрыяльнай адказнасці гэтай арганізацыі і канкрэтных кіраўнікоў, — падкрэсліў ён. — Сурова, жорстка, але па-іншаму не атрымліваецца. Чаму за кошт эканомікі ўсёй краіны нехта павінен хаваць сваю безгаспадарчасць?»

Міхаіл Мясніковіч дадаў, што за мерапрыемствамі рэспубліканскага плана па правядзенні Года беражлівасці павінна стаяць канкрэтная работа.

**Паводле матэрыялаў БЕЛТА.**

■ Соцыум

# ПАЧАЛАСЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА 70-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ І 70-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

**Да 70-годдзя вызвалення Беларусі і 70-годдзя Перамогі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны атрымаюць матэрыяльную дапамогу (да 3 ліпеня 2014 года і да 9 мая 2015 года адпаведна).**

Згодна з планам падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў па святкаванні 70-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, які быў зацверджаны Указам Прэзідэнта ад 20 мая 2013 года, ветэранам таксама ўручаць памятныя падарункі за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, юрыдычных асоб, у тым ліку грамадскіх аб'яднанняў.

Будуць вывучаны сацыяльна-бытавыя ўмовы жыцця ўсіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, членаў сем'яў вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі (памерлі) у гады вайны, і асобных катэгорый грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Пры неабходнасці за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў будуць адрамантаваны кватэры і дамы адзінокіх людзей, якія падпадаюць пад вышэйназваныя катэгорыі.

Міністэрствам аховы здароўя запланавана правядзенне комплексных медаглядаў, аказанне медыцынскай дапамогі ветэранам ВАВ у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя.

Інваліды і ўдзельнікі ВАВ 1—5 ліпеня 2014 года і 7—11 мая 2015 года змогуць бясплатна карыстацца паслугамі стацыянарнай тэлефоннай сувязі на тэрыторыі нашай краіны.

Плануецца заснаванне і ўручэнне юбілейнага медаля «70 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» ветэранам ВАВ, былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і былым непаўналетнім вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, а таксама іншым катэгорыям грамадзян. Акрамя таго, рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў заснаваны такія адзіныя юбілейныя ўзнагароды, як ганаровы ордэн «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў» і юбілейны медаль «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».

## Даведка

*Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі, па стане на 1 красавіка гэтага года ў Беларусі пражываюць 25312 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Усяго ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — 17685, з іх 4823 чалавекі з'яўляюцца інвалідамі вайны першай і другой груп.*

*У нашай краіне жывуць 103 чалавекі, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах; 728 чалавек, якія працавалі ў Ленінградзе ў перыяд блакады і былі ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», а таксама знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».*

*Акрамя таго, у Беларусі пражывае 941 інвалід з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з іх наступствамі; 1732 члены сем'яў загінулых воінаў і партызан. 31549 жыхароў рэспублікі прызнаны былымі вязнямі фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета.*

**Святлана БУСЬКО.**

# КНЯЖЫЦКІ КАСЦЁЛ СТАІЦЬ «БЯСХОЗНЫ»

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці выявіў парушэнні і недахопы ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Іх абмеркавалі на калегіі КДК Магілёўскай вобласці з удзелам старшыні КДК Беларусі Аляксандра Якабсона.**

Спецыялісты праверылі ў рэгіёне 140 нерухомых аб'ектаў, якія належаць да гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Напрыклад, касцёл у вёсцы Княжыцы Магілёўскага раёна, помнік архітэктуры XVII стагоддзя. Будынак знаходзіцца ў аварыйным стане, дзяржаўнай праграмай прадугледжана кансервацыя касцёла.

«Паводле планаў, — гаворыцца ў прэс-рэлізе КДК, — яшчэ летась трэба было арганізаваць правядзенне адпаведных работ і сёлета ўсё выканаць. Аднак да гэтага часу ў Княжыцах праца так і не пачалася, старажытны касцёл працягвае разбурацца. Больш за тое, на яго так і не аформлена належная дакументацыя, і, па сутнасці, гэты архітэктурны помнік з'яўляецца бясхозным».

Дарэчы, касцёл — не адзіная гісторыка-культурная каштоўнасць, якая засталася без гаспадара. Маніторынг КДК выявіў 6 такіх аб'ектаў у Магілёўскай вобласці, і з гэтым уладам трэба разабрацца.

Таксама Камітэт дзяржкантролю турбуе лёс сядзібы ў вёсцы Грудзінаўка Быхаўскага раёна. Гэты палацава-паркавы ансамбль XIX стагоддзя калісьці належаў графам Талстым. Запланавана, што ў гэтай пяцігодцы павінна быць зроблена праектна-каштарысная дакументацыя на рэканструкцыю з рэстаўрацыяй сядзібы.

«Устаноўлена, што з-за недахопу фінансавання работы па комплексе ў Грудзінаўцы вядуцца крайне павольна, — каментуюць у КДК прэсе. — Па аб'екце ўжо больш за 4 гады доўжыцца праектна-вышукальная праца, на яе выдаткавана больш за 600 мільёнаў рублёў».

Да таго ж не на ўсіх аб'ектах, якія належаць да гісторыка-культурных каштоўнасцяў, ёсць ахоўныя дошкі. Праблемы з падтрыманнем гэтых будынкаў у належным стане выяўлены ў большасці раёнаў вобласці, дзе праводзіўся маніторынг.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «РАЗУМНЫ» ДОМ ЗАЛІЧЫЛІ Ў ЧЛЕНЫ СЯМ'І

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Аднак у доме адсутнічаюць звыклыя нам батарэі...**

— Іх сапраўды няма. У доме ёсць сучасны кацёл, які выкарыстоўвае самае экалагічнае і эканамічнае сёння паліва — прыродны газ. Больш за тое, на 70 працэнтаў патрэба дома ў гарачай вадзе задавальняецца праз сонечныя калектары, а астатнія 30 працэнтаў — за кошт газавага катла.

Амаль па ўсім доме праведзена сістэма цёплай падлогі, якая кіруецца электрапрыводамі і кантралюецца тэмпературнымі датчыкамі. Таму ў кожным памяшканні ствараецца свой тэмпературны рэжым. Мы вырашылі, што ў ванным пакоі ён будзе плюс 25 градусаў, у спальні — 22, а ў гардэробных пакоях — ужо толькі 18 градусаў. Такім чынам мы кожнае памяшканне ў нашым доме адзаніравалі. Потым гэтыя тэмпературныя рэжымы можна будзе карэктаваць у залежнасці ад канкрэтных пажаданняў усіх членаў сям'і.

**— У вашай сям'і адна дачка, а ў доме тры спальні. Спадар дырэктар шыкуе?**

— Да гэтага часу мы жылі ў звычайнай кватэры стандартнай шматпавярхоўкі. Жонка мне казала, што колькасць дзяцей павялічыцца ў тым выпадку, калі ў нас будзе свой прасторны дом. Трэцяя спальня доўга пуставаць не будзе.

**— У вашых спальнях некалькі зон, дзе, мне здаецца, будзе яшчэ нейкае абсталяванне?**

— У кожным спальным пакоі прадугледжаны свой санвузел. А на першым паверсе зроблены яшчэ і асобны — гасцявы, бо ў бліжэйшы час у нашым дэманстрацыйным доме будзе шмат наведвальнікаў. Чаму чатыры прыбіральні ў доме? Ды ўсё проста, бо ў кожным жылым пакоі павінна быць менавіта асабістая прастора.

**— Другі паверх у вас пачынаецца неяк вельмі арыгінальна...**

— Там зроблены працоўны пакой без адной сцяны, таму адтуль цудоўна відаць, што робіцца на першым паверсе. Зараз на другім паверсе знаходзяцца і два спальныя пакоі. У гэтых памяшканнях зроблены максімальна высокія рознаўзроўневыя столі вышынёй ад трох да чатырох метраў дваццаці сантыметраў.

У такіх пакоях шмат паветра і святла, там адчуваецца прастора. Тут можна марыць пра цудоўнае і займацца творчасцю.

У столі (а дакладней, у даху) зроблены невялікія мансардныя вокны і светлавыя тунэлі. Таму тут дастаткова натуральнага святла да таго часу, пакуль не пачнуцца прыцемкі. А вось штучнае асвятленне прадугледжвае выкарыстанне святлодыёдаў і індукцыйных лямпачак, што істотна эканоміць электраэнергію. У кабінеце (сонечны бок) зроблена аўтаматычная ралетная сістэма. Як толькі сонейка пачынае занадта награваць паветра ў доме, то ралеты самі апускаюцца і тэмпература зніжаецца. З цягам часу ў памяшканнях будуць устаноўлены ўнутраныя сонцаахоўныя сістэмы ўжо не такога глабальнага прынцыпу дзеяння.




**Увесь дом «апрануты ў футра» больш шчыльнага ўцяпляльніка, які не баіцца знешняга ўздзеяння. Гэты фасадны ўцяпляльнік абараняе ўсе канструкцыі дома ад прамярзання зімой. Менавіта дзякуючы выкарыстанню гэтых інавацыйных тэхналогій энергаспажыванне гэтага дома становіцца ў 4 разы ніжэй за існуючы стандарт.**

**— За кошт яшчэ якіх навінак будзе дасягнута мінімальнае энергаспажыванне дома?**

— Пэўную частку электраэнергіі нам будуць даваць «фотавальтакі» сонечных батарэй. Крыху пазней у нас пачне працаваць вятрак. А гэта ўжо пераводзіць наш мультыкамфортны дом у шэраг «актыўных» дамоў, здольных аддаваць у сетку лішкі электрычнасці.

**— Усе гэтыя навінкі каштуюць добрых грошай?**

— Прымяненне энергазберагальных тэхналогій павялічвае сабекошт квадратнага метра падобнага індывідуальнага жылля прыкладна на 10—15 працэнтаў. Аднак укладанні акупляюцца за 6—7 гадоў.

**— Вядома, што ў працы над домам аб'ядналі намаганні прагрэсіўныя кампаніі будаўнічай галіны. Якім стаў сабекошт гэтага дома? І якую частку фінансавання такога будаўніцтва аплачваў сам гаспадар?**

— Сабекошт гэтага ўнікальнага дома з усімі інавацыйнымі інжынернымі сістэмамі склаў 330 тысяч долараў. Агульная плошча нашага дома складае каля 200 квадратных метраў. Атрымліваецца, што квадратны метр агульнай плошчы такога жылля каштуе прыкладна 1500 долараў. Падобны кошт квадратнага метра жылля існуе ў стандартных кватэрах сталіцы.

Наша кампанія, дзе я з'яўляюся дырэктарам, займалася ўсімі будаўніча-мантажнымі работамі. Будматэрыялы мы часткова набывалі за ўласныя грошы, а часткова яны былі прадастаўлены ў межах пілотнага праекта.

Падлічыць долю ўкладу кампаній партнёраў і непасрэдна гаспадара і яго фірмы зараз будзе крыху складана. Дом пабудаваны на нашай зямлі і будзе належаць менавіта маёй сям'і. Гэты «разумны» дом ужо зараз залічаны ў члены нашай сям'і. У нас заключаны дагаворы, згодна з якімі гэты дом будзе выкарыстоўвацца ў маркетынгавых мэтах для далейшага прасоўвання канцэпцыі будаўніцтва мультыкамфортнага жылля ў нашай краіне.

З першых дзён лета на працягу трох месяцаў дом будзе даступны да свабоднага наведвання ўсімі зацікаўленымі бакамі з 8.00 да 17.00. Потым ён будзе даступны для наведвання кампаніямі-партнёрамі з мэтай ажыццяўлення спецыяльных рэкламных акцый.

**— Ці будзе мець такое жыллё рэальны попыт на рынку Беларусі?**

— Упэўнены, што наша кампанія разам з партнёрамі пачне будаваць падобныя дамы, толькі лепш. На працягу двух наступных гадоў спецыялістамі і членамі маёй сям'і будзе весціся тэставанне нашага «разумнага» дома.

**На 70 працэнтаў патрэба дома ў гарачай вадзе задавальняецца праз сонечныя калектары, а астатнія 30 працэнтаў — за кошт газавага катла.**

Так, гэта не бюджэтны стандартны дом, а сапраўды якаснае індывідуальнае жыллё, якое дазваляе жыць у нашай краіне з адпаведным еўрапейскім камфортам. Ёсць меркаванне, што агульная плошча такіх энергаэфектыўных дамоў можа складаць не 200 «квадратаў», а ад 120 да 150 квадратных метраў. Магчыма, што для іншых новых гаспадароў такога жылля будзе вырашана адмовіцца ад нейкіх вельмі дарагіх тэхналагічных навінак. Таму агульны кошт такіх мультыкамфортных дамоў будзе толькі змяншацца. А людзей у нашай краіне з грашыма хапае...

**Сяргей КУРКАЧ.**

*Мінск—Дзяржынск.*

■ Рэканструкцыя

# НЕАПРАЎДАНАЯ «ШЧОДРАСЦЬ» ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ВЯЛІКІХ ЗАТРАТ

**Стан развіцця будаўнічага комплексу Міншчыны прааналізаваны на выязным пасяджэнні Мінаблвыканкама ў Стаўбцоўскім раёне. Сёлета ў цэнтральным рэгіёне прадугледжваецца ўвесці ў эксплуатацыю 1400 тысяч квадратных метраў жылля. За першае паўгоддзе гэты паказчык павінен скласці 700 тыс. «квадратаў», а за студзень—красавік здадзена крыху больш за 400 тысяч м² (менш за 30 працэнтаў гадавога задання).**

«У цэлым будаўнічы комплекс вобласці працуе нядрэнна, — адзначыў **губернатар Міншчыны Барыс БАТУРА**. — Але істотных зрухаў тут няма. Мы павінны рабіць стаўку на ўзвядзенне энергаэфектыўных, надзейных дамоў, якія дазволілі б скараціць затраты на іх эксплуатацыю. Важная тэма для нас — рэканструкцыя фермаў. Тут асабліва відаць, наколькі адстаў праектны комплекс: у большасці выпадкаў назіраецца бяздумны і бяздарны падыход».

Барыс Батура прывёў прыклады неапраўданай «шчодрасці» праектавання пры рэканструкцыі жывёлагадоўчых памяшканняў у шэрагу раёнаў. Там, дзе можна было іх дапрацаваць, будынкі проста разбураюць і ўзводзяць новыя. Кошт праектных работ завышаецца і даходзіць да 15-20 працэнтаў ад агульнага каштарысу будаўніцтва. «У асноўным праектуюцца такія збудаванні, якія патрабуюць вялікіх матэрыяльных і працоўных затрат», — падкрэсліў губернатар.

Але ёсць і прыклады гаспадарлівага падыходу да рэканструкцыі жывёлагадоўчых комплексаў. У прыватнасці, на малочнатаварнай ферме «Горкі» адкрытага акцыянернага таварыства «Жацерава» на 550 галоў. Менавіта тут кіраўнікам раёнаў і іх намеснікам па будаўніцтве прадэманстравалі, як з найменшымі затратамі выканаць пастаўленую задачу.

Шмат пытанняў узнікае і пры праектаванні жылля. Як сведчыць мінулы год, больш за ўсё грамадзяне скардзіліся на якасць будаўнічых работ і тэрміны здачы дамоў, якія зацягваюцца. Як правіла, старшыні райвыканкамаў больш увагі надаюць аб'ектам сельскай гаспадаркі. Між тым, ад развіцця будаўнічага комплексу ў многім залежыць і стан спраў у аграрным сектары.

Па словах кіраўніка вобласці, сур'ёзна адстае і вытворча-тэхнічная база будаўнічых арганізацый. Да гэтага часу не завершана рэканструкцыя Салігорскага і Барысаўскага домабудаўнічых камбінатаў. У будаўнічым комплексе амаль 15 працэнтаў прадпрыемстваў — стратныя. Каб выйсці на запланаваныя аб'ёмы будаўніцтва, сёння не хапае прыблізна 1,5 тысячы чалавек. А гэта, на думку Барыса Батуры, сведчыць пра недахопы ў кадравай рабоце. Сярэдняя зарплата ў будаўнічай галіне Міншчыны за першы квартал выйшла за межы 6-ці мільёнаў рублёў. Разам з тым у асобных арганізацыях унітарнага прадпрыемства «Мінскаблсельбуд» заробкі не перавысілі і 4-х мільёнаў.

Губернатар выказаў заўвагі і на адрас архітэктурнай службы вобласці: «У кожнага райцэнтра, кожнага сельскага населенага пункта павінен быць свой шарм. Яны павінны вылучацца архітэктурай, мець адметны выгляд».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:

| № лота | Наименование имущества | Место нахождения имущества | Собственник | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона | Реквизиты для оплаты задатка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ИМУЩЕСТВА (без учета НДС) | | | | | | |
| 1 | Дебиторская задолженность Севостьянов Андрей Леонидович | **г. Гомель, ул. Молодости, 5** | **ЗАО «Белремстройторг»** | **19 332 604** | **966 630** | **966 630** | р/с № 3012751058016 – текущий в белорусских рублях в ЦКО № 3 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, МФО 153001739, УНП 400030096 |
| 2 | Дебиторская задолженность ООО «Стилиум» (РФ), уценка на 10%; цена, задаток и шаг аукциона указанны в российских рублях | **г. Гомель, ул. Молодости, 5** | **ЧТУП «Снабсоюзэлектропром»** | **1410586,40** | **70529,32** | **72529,32** | р/с 3012401174546 в ЦБУ № 400 ОАО «Приорбанк», код банка 749, УНП 490323427, задаток и оплата лота производится в белорусских рублях по курсу Нац. банка РБ на дату платежа |

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ЗАО «Белремстройторг» и заместитель директора ООО «Диспонент» – Будков Д.В.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется **до 13.06.2013 г. (включительно)** по реквизитам, указанным выше.

Условия продажи – без условий.

С лотами можно ознакомиться **с 10.00 по 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5.**

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 13.06.2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Дата, время, место проведения открытого аукциона – **14.06.2013 года в 14.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Внесение задатка и оплата лота № 2, указанного в российских рублях, производится в белорусских рублях по курсу Нац. банка РБ на дату соответствующего платежа.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 655-33-68; (8029) 621-22-36.**



В объявлении о проведении повторного аукциона без условий о продаже недвижимого имущества Молодечненского районного потребительского общества, изданного 16.05.2013 в газете «Звязда» № 87, содержатся неверные сведения о сроках приема заявок на участие в аукционе. **Датой конечного срока приема заявок (также датой перечисления задатка) СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ 29.05.2013.**

УНП 600213608


НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## УВАГА: ДЗЕЦІ НА ДАРОЗЕ!

**За чатыры апошнія месяцы на дарогах краіны ў 60 дарожна-транспартных здарэннях загінула 4 дзіцяці. Яшчэ 58 маленькіх удзельнікаў дарожнага руху ў падобных абставінах атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.**

Каб прадухіліць магчымыя няшчасныя выпадкі з пачаткам летніх канікул, у перыяд з 27 мая па 7 чэрвеня ў Беларусі будзе праводзіцца акцыя «Увага — дзеці!» Па інфармацыі ўпраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі, асноўную прафілактыку накіруюць на бацькоў і вадзіцеляў, якія на бацькоўскіх сходах і спецыяльных сустрэчах у працоўных калектывах пачуюць пра прычыны і наступствы дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей.

Каб не дапусціць няшчаснага выпадку з дзіцем, бацькам раяць прытрымлівацца некалькіх простых правілаў: па-першае, да шасці-сямі гадоў дзіця ўвогуле не павінна знаходзіцца побач з праезнай часткай адно; па-другое, сына ці дачку варта прывучыць не стаяць у машыне падчас руху, а сядзець у спецыяльным дзіцячым крэсле і правільна пераходзіць вуліцу. Кіроўцам жа раяць быць уважлівымі пры выездзе з двароў і перад пешаходнымі пераходамі каля дзіцячых садкоў і школ.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ЦЕРПЯЦЬ ЛЮДЗІ І ПАБУДОВЫ

**Нямала бяды апошнімі днямі прынесла навальніца ў гарады і вёскі Брэстчыны. У панядзелак пад вечар у Баранавічах так разышлася бура, што паваліла франтон дома па вуліцы Леніна.**

Як паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС, чатырохпавярховы дом знаходзіцца на балансе ЖЭС-2 райцэнтра. Зараз там якраз вядзецца рэканструкцыя. Як высветлілі выратавальнікі, франтон упаў ад моцнага ветру. Траўмы атрымалі два чалавекі. Жанчыны 1962 і 1970 гадоў нараджэння былі дастаўлены ў бальніцу, але пасля аказання дапамогі адпушчаны дадому.

У гэты ж дзень з-за моцнага ветру пацярпелі стрэхі на 30 сельгаспабудовах Лунінецкага, Івацэвіцкага, Баранавіцкага і Пінскага раёнаў. У Пінску вецер вывернуў некалькі дрэў з каранямі.

А днём раней адбыўся шэраг пажараў з-за маланкі. У вёсцы Дубай Столінскага раёна агнём знішчаны дах аднаго з дамоў. У Лесіне Баранавіцкага раёна згарэў хлеў, а ў вёсцы Чудзін Ганцавіцкага раёна пашкоджана гаспадарчая пабудова.

У суботу ж праліўныя дажджы сталі прычынай падтаплення ў Брэсце і Брэсцкім раёне. Падтоплены жылыя дамы па вуліцах Багданчука і Скрыпнікава. Пад вадой аказаліся падворкі ў вёсках Скокі і Матыкалы. На дапамогу людзям выязджалі камунальнікі і выратавальнікі. Паводле інфармацыі МНС, наступствы стыхіі ліквідаваны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## І «МАРШ МНС»...

**У Віцебску выратавальнікі з усіх рэгіёнаў Беларусі возьмуць удзел у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе самадзейнай творчасці сярод органаў, падраздзяленняў і арганізацый сістэмы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Незвычайны канцэртны марафон праходзіць на сцэне абласной філармоніі і доўжыцца 3 дні. Паказаць сябе, паглядзець на іншых і, безумоўна, пазмагацца за прызавыя месцы прыехалі 16 каманд-удзельніц. Канкурсанты змагаюцца за Гран-пры ў 9 намінацыях: яны і спяваюць, і вершы чытаюць, дэманструюць здольнасці ў рэжысуры і гэтак далей. І калі паглядзець збоку, далёка не кожны здагадаецца, што гэта не прафесіяналы, а аматары — самі супрацоўнікі МНС і члены іх сем'яў.

— У конкурснай праграме ёсць спецыяльная намінацыя — «Марш МНС» — марш выратавальнікаў-пажарных», — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Устанаўліваючы гэтую намінацыю, кіраўніцтва МНС паставіла за мэту стварэнне своеасаблівага гімна ведамства — аб працоўных буднях органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях...

Не толькі журы, але гледачы могуць ацаніць узровень выканальніцкага майстэрства калектываў і выканаўцаў, артыстызм, сцэнічную культуру і гістарычную спадчыну прафесіі пажарнага-выратавальніка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АДЗІН ДОМА?

**У Рэчыцы 11-гадовы хлопчык, які гуляў на тэрыторыі гаражнага кааператыва, захрас нагой паміж двума металічнымі памяшканнямі для машын. Супрацоўнікі МНС вызвалялі школьніка пры дапамозе гідраўлічнага інструменту.**

Абышлося без сур'ёзнай траўмы — шпіталізацыя не спатрэбілася. А ў вёсцы Збораў Рагачоўскага раёна паўтарагадовае дзіця атруцілася дызельным палівам. Сусед рамантаваў аўтамабіль, а побач стаялі звычайныя бутэлькі, напоўненыя гаручай вадкасцю. Дзіця выпадкова глынула з ёмістасці. Трывогу падняў яго старэйшы брат, які паклікаў на дапамогу дарослых.

Дзіця шпіталізавалі ў раённую бальніцу. Другі выпадак атручэння дзіцяці гаруча-змазачнымі матэрыяламі зарэгістраваны ў вёсцы Гарадзец зноў жа на Рагачоўшчыне. У прыбудове маленькі хлопчык знайшоў слоік з рэшткамі бензіну. Дзіця крыху глынула вадкасці. З тэрмічнымі апёкамі рота яго даставілі ў бальніцу. Па гэтых фактах праводзіцца праверка.

## 6 КІЛАГРАМАЎ РТУЦІ Ў ДВАРЫ

**У двары свайго дома, пад дрэвам, гамяльчанін нечакана знайшоў гліняную пасудзіну з ртуццю.**

Супрацоўнікі МНС выехалі на вуліцу Лепяшынскага і пераканаліся: небяспечнае рэчыва вагой каля 6 кг знаходзілася ў ёмістасці, закрытай скуранай тканінай і абгорнутай металічным дротам. Спецыялісты пераканаліся, што разліванне не адбылося. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што супрацоўнікі службы хімічнай і радыяцыйнай абароны канфіскавалі вадкі метал для далейшай утылізацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## УДАРЫЛА НАЖОМ БЫЛОГА...

**Полацкім міжраённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 54-гадовай жанчыны, якая ўдарыла нажом свайго былога мужа.**

— Следствам устаноўлена, што былыя муж і жонка, якія пражываюць сумесна, распівалі спіртныя напоі па месцы жыхарства. Паміж імі раптоўна ўзнікла сварка, у выніку якой пенсіянерка нанесла свайму былому мужу ўдар нажом, — паведаміла **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці**. — Падазроная затрымана, пацярпелы знаходзіцца ў шпіталі. Следствам устанаўліваюцца прычыны канфлікту.

Згодна з Крымінальным кодэксам, за ўчыненае прадугледжваецца пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін ад 3 да 5 гадоў або пазбаўленне волі на тэрмін ад 4 да 8 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

У **суд Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым Балдзянкова Віктара Аляксандравіча, 17 студзеня 1961 года нараджэння, ураджэнца г. Орша Віцебскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Рагачоў Гомельскай вобл., вул. Набярэжная, 78, корп. 2, пакой 702. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Балдзянкова В.А., паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

# БЕЛЫЯ ВЕТРАЗІ, КВЕТКАВЫЯ ЎЗОРЫ...

**У аграгарадку Верамейкі Чэрыкаўскага раёна заатэхнік на пенсіі будуе на двары дома яхту, а яго жонка распісвае матрошак і піша душэўныя вершы. Ларыса Мікалаеўна і Юрый Васільевіч Кальмаевы — творчая сям'я.**



## МАТРОШКІ — НАРАСХВАТ

Яна ў святочнай чырвонай хустцы з прыгожым кветкавым узорам. Зялёная кашуля, жоўтая спадніца, белы фартух, а ў руцэ — чорны певень. Шчокі ружовыя, вусны пунсовыя, вочы ласкавыя, усмешка добрая. Так выглядае матрошка ў выкананні Ларысы Кальмаевай.

На вялікім стале ў пакоі, дзе гаспадыня займаецца сваёй мастацкай справай, стаіць цэлы «выводак» сімпатычных матрошак розных памераў і колераў. У руках — то серп, то кошык, то гаршчок. Самая маленькая — у блакітнай сукенцы, цягне па-дзіцячы палец у рот.

— Я сваіх матрошак сапраўды ўспрымаю як дзяцей, — кажа майстрыха. — Калі іх малюю, то ўкладаю частку сваёй душы ў гэтыя цацкі, імкнуся не проста фарбу наляпіць — матрошкі для мяне жывыя. Нібыта мой дзіцячы садок.

Ларыса Мікалаеўна і яе муж родам з Беларусі, але пасля размеркавання яшчэ ў савецкі час трапілі ў Краснадарскі край, аднак на пачатку 1990-х збеглі ад «жахаў новага часу», як цяпер узгадвае жанчына, вярнуліся на радзіму. Сваё сённяшняе месца жыхарства ў беларускай глыбінцы яны называюць «казкай»: маўляў, прырода і свежае паветра, грыбы і ягады ў лесе праз дарогу, у аграгарадку ёсць усе выгоды, навокал чыста і прыгожа. Добрае месца для жыцця і творчасці.

Вялікі стол насупраць акна. Яркая лямпа, фарбы і пэндзлі. Ларыса Мікалаеўна бярэ ў рукі гладкую драўляную «балванку» і паказвае, як з яе атрымліваецца прыгожая матрошка. Спачатку робіцца алоўкам эскіз, потым контуры выпальваюцца спецыяльным прыборам. Фарбаваць трэба акварэлямі, а ўзоры малююць гелевай ручкай. На заканчэнне ўся гэтая прыгажосць пакрываецца фінскім лакам.



Пакуль чарговая хустка становіцца чырвонай, майстрыха расказвае пра свае любімыя творы. Традыцыйныя матрошкі складаюцца з пяці альбо васьмі лялек. Рабіць «васьмёрку» — даволі цяжкая праца, гаворыць Кальмаева, бо самыя апошнія лялькі ў наборы — зусім маленечкія, іх фарбаванне патрабуе цярплівасці і дакладнасці. На выкананне такіх набораў патрабуецца два-тры працоўныя дні.

Матрошкі — гэта не проста хобі, але і спосаб атрымаць дадатковыя грошы да пенсіі. Дачка Ларысы Мікалаеўны, мастачка, навучыла маці распісваць матрошак, а збыт наладжаны ў Санкт-Пецярбургу: на рынку, дзе прадаюць тавары для замежных турыстаў, матрошкі ідуць нарасхват.

Розныя фантазійныя вобразы засталіся на фотаздымках: матрошкі могуць быць з белымі гусакамі, шчанятамі і кацянятамі. З самаварамі і чайнікамі. І нават з бычком, калі размова ідзе пра год Быка. Можна сказаць па-сучаснаму: гэта стыльныя цацкі ў актуальным народным стылі.

— Можна маляваць, як хочаш, — кажа Ларыса Мікалаеўна. — Мне галоўнае, каб твар быў не сумным, спагадлівым. Каб было прыемна на матрошак глядзець.

## ЯХТА З ДЗІЦЯЧАЙ МАРЫ

Каля вялікага ганку з калонамі цвітуць цюльпаны — сярод іх ёсць і махровы фіялетавы, амаль што чорны. Але сапраўднае дзіва можна ўбачыць на задках сельскага катэджа: на фоне ярка-зялёнага майскага поля на металічных канструкцыях стаіць вялізная лодка. Што гэта за цуд? Гэта яхта «Брыз», якая сёлетнім летам, паводле планаў гаспадара, пройдзе ходавыя выпрабаванні на Сожы.

Юрый Васільевіч у юнацтве марыў пра мараходнае вучылішча. Не спраўдзілася, і ён стаў спецыялістам у жывёлагадоўлі. Але мара засталася і пераўтварылася ў хобі. Аказалася, дарэчы, што будаўніцтва яхты адцягвае ўвагу ад шматлікіх праблем і вызваляе галаву ад цяжкіх думак.

— Восем гадоў таму я пачаў будаваць, — паказвае ён. — Яхта з драўлянай рэйкі, абшытая шклотканінай. Сёлета выходжу на фінішную прамую і спадзяюся спусціць на ваду.

Кальмаеў — не зусім далёкі чалавек ад суднаходства. У Краснадарскім краі на катары ён тысячы кіламетраў прайшоў па моры і рэчках.

— Аднак маторныя лодкі — гэта рух, хуткасць, нават палёт, — узгадвае Юрый Васільевіч. — А хочацца спакою. Таму буду хадзіць пад ветразямі. Іх ужо шыюць: ветразі на «Брызе» будуць белыя. Аднак у сухапутных Верамейках няма ні рэчкі, ні возера, таму яхту самі гаспадары называюць «лясной». Аднак з дапамогай канструкцыі на колах «Брыз» дацягнуць да вялікай вады.

Усе звычайна пытаюцца ў гаспадара: адкуль веды і колькі гэта каштавала? З першым дапамагла спецыяльная літаратура, візіты ў яхтклуб у Пецярбургу, а цяпер — і інтэрнэт. А каштавала яхта не так ужо і шмат: усё рабілася сваімі рукамі з драўніны, матор знайшлі патрыманы, і асноўныя выдаткі — гэта, як ні дзіўна, на ветразі.

На яхту трэба падымацца па хісткай прыстаўной лесвіцы. Але канапа там ужо стаіць: можна і цяпер адпачываць, гледзячы на мора травы.

Ларыса Мікалаеўна ганарыцца мэтанакіраванасцю мужа, Юрый Васільевіч захапляецца творчасцю жонкі. Не толькі матрошкамі: два гады таму яна нечакана стала пісаць вершы. Пра ўсё: жыццё, жанчын, душу. Свае творы Ларыса Кальмаева выкладае ў інтэрнэце. Чаму да яе нечакана прыйшлі рыфмаваныя думкі — сама яна растлумачыць не можа, але радуецца новаму павароту ў жыцці.

— Безумоўна, мы падтрымліваем адно аднаго, — усміхаюцца муж і жонка Кальмаевы. — Ведаеце, ёсць мары, памкненні стварыць нешта прыгожае. Жывеш толькі аднойчы, таму трэба рабіць, калі па душы. І ў нас нядаўна ўнук нарадзіўся — ёсць каму перадаць у спадчыну яхту. Хлопчыка, дарэчы, завуць Аляксандрам Сяргеевічам — як Пушкіна. Значыць, будзе любіць бабуліны вершы і творчасць увогуле.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Чэрыкаўскі раён.*

**Фота аўтара.**

# АКТЫЎНЫ «ТРЭЦІ ЎЗРОСТ»

## У БРЭСЦЕ ПЛАНУЮЦЬ СТВАРЫЦЬ САЦЫЯЛЬНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Брэста абмеркавалі адкрыццё ў горадзе сацыяльнага прадпрыемства, дзе працавалі б выключна пенсіянеры і інваліды. Зразумела, што нарадзілася такая ідэя не на пустой глебе.

— Больш за два гады ў нашым тэрытарыяльным цэнтры працуе Інстытут трэцяга ўзросту, — гаворыць дырэктар цэнтра Жанна Стацiўка. — Гэтая ўстанова па арганізацыі вольнага часу пенсіянераў аказалася вельмі запатрабаванай. Ужо больш за тысячу пажылых людзей знайшлі ў яго сценах справу па душы, а цяпер нават прыводзяць сюды сяброў і суседзяў. З асаблівым задавальненнем нашы «навучэнцы» асвойваюць у творчых майстэрнях інстытута розныя віды рукадзелля. Падрыхтавана дванаццаць валанцёраў, якія ўжо самастойна вядуць заняткі. Таму сацыяльнае прадпрыемства — гэта проста наступны крок на абраным намі шляху. Выпускаць яно будзе сувенірную прадукцыю, а ў якасці сыравіны выкарыстоўваць... адходы вытворчасці. Але пакуль што існуе шмат праблем, якія мы павінны пераадолець: адсутнасць прававой базы, якая рэгулявала б падаткі, арэнду памяшканняў для такога прадпрыемства і іншыя моманты.

— Наш новы праект вельмі патрэбен пажылым людзям, — лічыць даўні партнёр тэрытарыяльнага цэнтра па стварэнні Інстытута трэцяга ўзросту, дэкан сацыяльна-педагагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Надзея Леанюк. — Мы працуем менавіта з тымі, хто ў любым узросце праяўляе неабыякавасць і актыўнасць. Адкрыццё прадпрыемства вырашыць як мінімум тры найважнейшыя праблемы: найменш сацыяльна абароненыя людзі атрымаюць дадатковыя даходы, з'явіцца больш цікавай сувенірнай прадукцыі, сыравіна будзе выкарыстоўвацца рацыянальна. На дадзеным этапе патрабуецца «вуда», а рыбу нашы падапечныя будуць лавіць самі.



**Сувеніры, зробленыя «навучэнцамі» Інстытута трэцяга ўзросту ў творчых майстэрнях, выклікалі вялікую цікавасць.**

Дырэктар фірмы «ЛазерГруп» Сяргей Саламацін ужо мае пэўны вопыт стварэння безадходнай вытворчасці. Ён ведае, як літаральна з «нічога» рабіць прыемныя і патрэбныя дробязі, таму ахвотна падзяліўся сваіміназіраннямі. Але найбольш красамоўна аб іх сведчылі сувеніры, якія ён прынёс з сабой.

— «ЛазерГруп» дзевяць гадоў выпускае пячаткі, візуальную рэкламу, розную сувенірную прадукцыю, — растлумачыў Сяргей Саламацін. — Памятаю той час, калі без усялякіх ваганняў рэшткі сыравіны адпраўляліся на сметнік. Цяпер жа нічога не прападае дарэмна, усё ідзе ў справу. Распрацавана пэўная сістэма, як выкарыстоўваць нават самыя нязначныя адходы.

Кіраўнік Брэсцкага навукова-тэхналагічнага парка Андрэй Сыцько прапанаваў са свайго боку аказанне ўсялякага роду падтрымкі новаму праекту. А пасля таго, як прадпрыемства пачне выпускаць сувенірную прадукцыю, паабяцаў забяспечыць яе прасоўванне на рынку.

Эксперт па сацыяльных пытаннях Міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханэса Рау, прадстаўнік праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Раіса Сінельнікава ўпэўнена, што ўсе размовы пра новае прадпрыемства рызыкуюць так і застацца словамі, калі адразу не зрабіць нейкіх практычных крокаў. Магчыма, спярша трэба заручыцца падтрымкай мясцовых органаў улады, накіраваць лісты ў адпаведныя міністэрствы, стварыць ініцыятыўную групу. Яе больш за ўсё цікавілі думкі наконт стварэння сацыяльнага прадпрыемства тых, хто ў перспектыве плануе на ім працаваць.

«Студэнты» Інстытута трэцяга ўзросту, усе без выключэння, прагаласавалі за адкрыццё сацыяльнага прадпрыемства. Яны загадзя падрыхтавалі выставу «Азбука беражлівасці», якая сведчыла аб тым, што творчыя майстэрні сабралі пад сваім крылом сапраўды таленавітых людзей. А валанцёры інстытута, як той казаў, не адыходзячы ад касы, правялі майстар-клас «Прыгожае з непатрэбнага», паказаўшы, якім чынам ва ўмелых руках старыя рэчы набываюць другое жыццё.

— Напрыклад, яшчэ некалькі хвілін таму я трымала ў руках звычайныя абрэзкі тканіны, а зараз з іх атрымалася лялька-прыгажуня, — усміхаецца валанцёр Нона Аўчарова. — На мой погляд, у гэтай ляльцы закладзена столькі цяпла і дабрыні, што яна можа стаць для яе ўладальніка сапраўдным абярэгам. У нас шмат планаў і задумак у гэтым кірунку.

**Ала ВЕРСТАВА.**
**Фота аўтара.**

# «РОЗНЫЯ ДЗЕЦІ — РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ»

**Пад такім дэвізам на сталічнай пешаходнай вуліцы Карла Маркса прайшло дабрачыннае мерапрыемства ў рамках месячніка Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.**

Любы ахвотны змог даведацца аб дзейнасці Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, прыняць удзел у навучанні аказанню першай дапамогі і вымераць артэрыяльны ціск, пазнаёміцца з дзейнасцю атрада хуткага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Чырвонага Крыжа, пошукава-выратавальнага атрада «Анёл».

Спевамі зазывала да сябе група з камітэта Чырвона Крыжа Заводскага раёна. Тут валанцёры старэйшага ўзросту маюць вельмі актыўную жыццёвую пазіцыю і вялікае жаданне дапамагчы *(фота)*.

— Нашы бабулі з задавальненнем наведваюць дзетак-сірот, прыходзяць да іх не толькі з салодкімі пачастункамі, а яшчэ і з цёплымі шалікамі і шапачкамі, што вяжуць самі, — распавядае старшыня групы валанцёраў камітэта Чырвона Крыжа Заводскага раёна Валянціна Маронава. — Зараз мы даглядаем трох адзінокіх ляжачых жанчын, да якіх ходзім амаль кожны дзень...

Рэспубліканскі месячнік Чырвонага Крыжа падыходзіць да завяршэння. У гэты час у краіне разгарнулася шырокая інфармацыйная кампанія, праходзяць дабрачынныя канцэрты. Валанцёры Чырвонага Крыжа праводзяць прэзентацыі, падчас якіх распавядаюць жыхарам горада аб дзейнасці грамадства. Яны таксама збіраюць вопратку, абутак, кнігі, школьныя прылады для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Трэнінгі, майстар-класы па навучанні навыкам аказання першай дапамогі, тэматычныя акцыі, конкурсы таксама прадугледжаны праграмай месячніка.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



**Спевамі зазывала да сябе група з камітэта Чырвонага Крыжа Заводскага раёна.**



**Пошукава-выратавальны атрад «Анёл».**



**Вясёлыя танцы ад выхаванцаў цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Светач».**

## ■ Крымінал

### УЖЫВАЛІ ОПІЙ АМАЛЬ НА ВАЧАХ У ДЗІЦЯЦІ

**У сталіцы супрацоўнікі наркакантролю Партызанскага РУУС разам з байцамі спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі сямейную пару, якая вырабляла і ўжывала опій у прысутнасці трохгадовага дзіцяці.**

— Аперацыя па затрыманні жыхароў кватэры па вуліцы Нёманскай адбывалася непасрэдна падчас вырабу і ўжывання апошнімі наркатычных рэчываў. Падчас агляду жылля былі знойдзены дзве бутэлькі толькі што прыгатаванага экстракцыйнага опію, а таксама інгрэдыенты для яго прыгатавання. Па ўсёй кватэры былі раскіданы шпрыцы з опіем, а таксама ўжо выкарыстаныя шпрыцы, — паведамілі ў Партызанскім РУУС. — Як высветлілася, у апошні час сямейная пара прыахвоцілася да вырабу і спажывання опію. Пры гэтым сужэнцы актыўна запрашалі да сябе ў госці іншых наркаманаў. За дзень такіх наведвальнікаў магло быць да дзясятка. За дозы наркотыку і дах над галавой госці разлічваліся пераважна кампанентамі для вырабу зелля. І пакуль дарослыя на кухні такім чынам «адцягваліся», у суседнім пакоі знаходзілася трохгадовае дзіця. Пасля затрымання бацькоў — 27-гадовага раней судзімага за крадзяжы і рабаванні главу сямейства, які нідзе не працаваў, і яго 24-гадовай жонкі, што была ў водпуску па доглядзе дзіцяці, — яго забралі спецыялісты ўпраўлення адукацыі. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ■ Здарэнні

### ВЫМАГАЎ ПЕНСІЮ Ў ЖОНКІ

**У сталіцы затрыманы падазроны, які вымагаў пенсію ў сваёй колішняй грамадзянскай жонкі. Цягам чатырох месяцаў 35-гадовая жанчына, пенсіянерка па інваліднасці, цярпела пабоі, але з-за пагроз мужчыны не звярталася ў міліцыю.**

— Пра сітуацыю стала вядома дзякуючы суседу жанчыны, які распавёў участковаму інспектару, што жанчыну збіваюць. Наведаўшы тую, міліцыянер пераканаўся ў праўдзівасці гэтых слоў: на твары пацярпелай былі гематомы, на лбе — след ад нядаўняга ўдару, — паведамілі ў Партызанскім РУУС. — Высветлілася, што жанчына сустрэла свайго колішняга грамадзянскага сужэнца, які папрасіў пазычыць яму 200 тысяч рублёў. Калі ж прыйшоў час вярнуць доўг, ён запатрабаваў, каб жанчына... штомесяц аддавала яму частку сваёй пенсіі па інваліднасці. Усе спробы пярэчання апошняй спыняліся ўдарамі па твары і целе. І так доўжылася чатыры месяцы, бо на просьбы маці звярнуцца ў міліцыю пацярпелая не рэагавала. Вось і ў апошні раз мужчына на просьбу не забіраць грошы зноў збіў жанчыну. Участковы інспектар адшукаў зламысніка і даставіў у РУУС. Высветлілася, што 30-гадовы непрацуючы нядаўна быў асуджаны на паўтара года пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання. Зараз у дачыненні да яго зноў заведзена крымінальная справа, на гэты раз — за вымагальніцтва.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ■ Пляжны сезон

# КУПАЦЦА МОЖНА, АЛЕ АСЦЯРОЖНА!

**Першая спёка ўжо спакусіла некаторых аматараў адпачынку на прыродзе зрабіць першы заплыў, але спецыялісты па камунальнай гігіене раяць пакуль не спяшацца з купаннем.**

Пра гэта паведаміла журналістам падчас прэс-канферэнцыі **загадчыца аддзялення камунальнай гігіены дзяржустановы «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» Міністэрства аховы здароўя Ірына ЖАЎНЯК.**

— Па санітарна-гігіенічных нормах супрацьпаказанняў для купання ў вадаёмах зараз няма. Падкрэслю, што размова ідзе пра рэкі, азёры і вадасховішчы, у якіх вядзецца строгі эпідэміялагічны кантроль. З канца наступнага тыдня на сайце Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі з'явіцца інфармацыя пра іх. Але спяшацца лезці ў ваду ўсё роўна пакуль не варта: зараз якраз той перыяд, калі пры 30-градуснай гарачыні тэмпература ў вадаёмах можа складаць не больш за 16 градусаў. Вада пакуль не прагрэлася. Пра камфортныя ўмовы для купання можна будзе гаварыць прыкладна з сярэдзіны чэрвеня, — адзначыла Ірына Віктараўна.

Дзе купанне дакладна забаронена, незалежна ад надвор'я і пары года, дык гэта на тэхнічных вадаёмах, напрыклад, Чыжоўскае вадасховішча ў Мінску. Як правіла, у такіх месцах няма ніякай інфраструктуры для адпачынку. Прычына простая: гэтыя вадаёмы для купання і не прадугледжаны.

Сёлета працяглая зіма і паводка ў некаторых рэгіёнах прывялі да таго, што наводзіць парадак на пляжах даводзіцца ў вельмі сціслы тэрмін. Як расказала **галоўны спецыяліст упраўлення камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена НОВІКАВА,** каб падрыхтаваць беларускія пляжы для адпачынку, зараз даследуюцца месцы для купання, акваторыі чысцяць ад старонніх прадметаў, рамантуюцца грамадскія туалеты і пляжнае абсталяванне, паднаўляюцца дзіцячыя пляцоўкі і пад'язныя шляхі, усталёўваюцца сметніцы і інфармацыйныя паказальнікі. Усяго за арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі замацавана 210 пляжаў. Да летняга сезона ўжо падрыхтавана 132 з іх.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 10 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

Сярод падпісчыкаў 12.07.2013 г. будуць разыграны 10 лічбавых цюнараў і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 27.07.2013 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 30.09.2013 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 25.04.13 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 30.04.13 па 30.09.13.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2139 ад 25.03.13, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
____________________ на III кв. або 2-е паўг. 2013 года

Хатні адрас і тэлефон ________ (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2013 ГОДА

З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Мясцовае самакіраванне · Ігуменскі тракт · Жырандоля · Плацдарм (Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь) · Чырвонка. Чырвоная змена · Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 39 000 рублёў на месяц<br>234 000 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 35 100 рублёў на месяц<br>210 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 78 000 рублёў на месяц<br>468 000 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 70 200 рублёў на месяц<br>421 200 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 31 600 рублёў на месяц<br>189 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 27 900 рублёў на месяц<br>167 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 63 264 рублёў на месяц<br>379 584 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 55 964 рублёў на месяц<br>335 784 рублёў на паўгоддзе |

* У залежнасці ад рэгіёна кошт можа крыху адрозніванца.

# «ПРЫВАТНЫЯ ВНУ ЗРАБІЛІ ЎПОР НА НАЙМЕНШ ЗАТРАТНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## «ХМАРЫ» НАД ЗАВОЧНАЙ ФОРМАЙ НАВУЧАННЯ

Для забеспячэння якаснай работы прыёмных камісій і аказання дапамогі абітурыентам, бацькам і грамадскасці ў атрыманні інфармацыі **з 1 чэрвеня па 21 жніўня ў Міністэрстве адукацыі будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія (222 43 12).** Шматгадовая практыка работы на «гарачай» лініі вопытных прадстаўнікоў ВНУ, кампетэнтных у пытаннях прыёму, цалкам апраўдала сябе. Апошнія добрасумленна і адказна падыходзяць да гэтай работы, даюць тлумачэнні абітурыентам і іх бацькам па ўсіх пытаннях не як тэарэтыкі, а як практыкі, зыходзячы са свайго досведу работы ў прыёмнай камісіі.

Агульны прыём на ўзровень вышэйшай адукацыі ў 54 ВНУ (45 дзяржаўнай формы ўласнасці і 9 — прыватнай) складзе ў 2013 годзе 79,3 тысячы чалавек. Пры гэтым на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту плануецца прыняць 30,5 тысячы чалавек, што менш, чым летась (32,2 тысячы), а на платнае навучанне — 47 тысяч чалавек, што таксама менш, чым летась (55,8 тысячы),

— План прыёму на бюджэтную і платную формы навучання фарміраваўся з улікам некалькіх абставін, — патлумачыў Аляксандр Жук. — Па-першае, улічвалася дэмаграфічная сітуацыя ў краіне: сёлета выпуск з агульнаадукацыйных школ складзе 59 тысяч чалавек, што на 6,4 тысячы чалавек менш, чым у папярэднім годзе. Па-другое, было прынята рашэнне аб скарачэнні на 10% агульных аб'ёмаў падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у параўнанні з 2012 годам. Былі перагледжаны і суадносіны падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у бок павелічэння прыёму на дзённую форму атрымання адукацыі.

— Праблема аптымізацыі прапорцыі паміж дзённай і завочнай формамі атрымання вышэйшай адукацыі, асабліва ў ВНУ прыватнай формы ўласнасці, стаіць вельмі востра, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Я асабіста нічога не маю супраць прыватнага сектара вышэйшай школы: усім вядома, што большасць універсітэтаў планеты — недзяржаўныя, і ў многіх краінах, перш за ўсё ў ЗША, гэты сектар прэваліруе. Але базавыя арыенціры многіх нашых прыватных ВНУ не дацягваюць да канкурэнтаздольнага ўзроўню. Большасць з іх ніяк нельга назваць буйнымі, у іх слабая база і слабы кантынгент выкладчыкаў. Да таго ж прыватныя ВНУ зрабілі ўпор на найменш затратныя спецыяльнасці з выключна тэарэтычнай падрыхтоўкай. Прычым, як правіла, асноўны ўпор робіцца там не столькі на дзённую форму навучання, колькі на менш «дарагую» — завочную. Дайшло нават да таго, што выпуск завочнікаў стаў перавышаць выпуск спецыялістаў, якія атрымалі паўнавартасную вочную адукацыю. Далейшае захаванне гэтай тэндэнцыі вельмі небяспечнае.

Прыватныя ВНУ арыентуюцца выключна на «попыт» насельніцтва і рыхтуюць спецыялістаў пераважна па так званых «прэстыжных» прафесіях (юрыстаў, эканамістаў і г. д.) і забываюць пра два іншыя найважнейшыя параметры — якасць іх падрыхтоўкі і запатрабаванасць эканомікай.

— Мяркую, што якасную падрыхтоўку могуць даць толькі ВНУ з моцным складам выкладчыкаў, сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай і эфектыўнымі сувязямі з рынкам працы. **Калі ў 2013 годзе ў прыватных ВНУ не зменіцца карціна з удзельнай вагой залічаных абітурыентаў, дзе студэнты дзённай формы навучання складаюць толькі трэцюю частку залічаных, сітуацыю давядзецца змяняць кардынальна,** — папярэдзіў Аляксандр Жук. — З усёй адказнасцю заяўляю, што ВНУ, дзе колькасць студэнтаў-першакурснікаў складае менш як 100 чалавек (пры тым, што падрыхтоўка ў кожнай ВНУ ажыццяўляецца па 5—7 спецыяльнасцях), нам не патрэбны.

## ПРОФІЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ — ТОЛЬКІ Ў ПРОФІЛЬНЫХ ВНУ

Паводле слоў першага намесніка міністра адукацыі, аналіз вынікаў уступнай кампаніі 2012 года выявіў шэраг праблем. Так, нягледзячы на скарачэнне летась на 5% прыёму на дзённую бюджэтную форму навучання, па выніках залічэння незапоўненымі засталіся 200 бюджэтных месцаў на дзённай форме навучання (пераважна на спецыяльнасцях педагагічнага профілю). «Гэта сведчыць пра недастатковую прафарыентацыйную работу вышэйшых навучальных устаноў, якія абапіраюцца на традыцыйныя формы яе правядзення і слаба працуюць з патэнцыяльнымі працадаўцамі», — лічаць у галоўным адукацыйным ведамстве.

Аналіз паказаў, што ў шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях, якія з'яўляюцца няпрофільнымі для гэтых устаноў адукацыі. Напрыклад, у вышэйшых навучальных установах Мінсельгасхарча чвэрць першакурснікаў у 2012 годзе былі залічаны на спецыяльнасці эканамічнага і юрыдычнага профіляў. Між іншым, выпускнікі ВНУ, якія атрымалі адукацыю па названых спецыяльнасцях, рэгіструюцца затым у службах занятасці насельніцтва, папаўняючы рады беспрацоўных.

Акрамя таго, што ўстановы адукацыі ажыццяўляюць прыём па няпрофільных спецыяльнасцях, дык яшчэ і якасць падрыхтоўкі па гэтых спецыяльнасцях пакідае жадаць лепшага. Так, у кастрычніку 2012 года Дэпартаментам кантролю якасці адукацыі было праведзена тэсціраванне студэнтаў па найбольш масавай спецыяльнасці эканамічнага профілю «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве». Тэсціраваннем былі ахоплены студэнты 22-х ВНУ, у тым ліку шасці прыватных. Нізкі ўзровень ведаў прадэманстравалі студэнты 12 ВНУ: 7 з іх знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства адукацыі, 2 — у падпарадкаванні Мінсельгасхарча і 3 маюць прыватную форму ўласнасці.

Менавіта таму сёлета на эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці як на найменш запатрабаваныя арганізацыямі — заказчыкамі кадраў прыём быў скарочаны на 160 бюджэтных месцаў. Акрамя таго, у 22 ВНУ быў закрыты прыём па некаторых эканамічных спецыяльнасцях, такіх як «Сусветная эканоміка», «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Менеджмент», «Камерцыйная дзейнасць», «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт».

**«Прыватныя ВНУ арыентуюцца выключна на «попыт» насельніцтва і забываюць пра два найважнейшыя параметры — якасць падрыхтоўкі спецыялістаў і іх запатрабаванасць эканомікай».**

Што тычыцца абнаўлення структуры падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, то гэты год не стаў выключэннем — попыт на новыя прыярытэтныя напрамкі развіцця рэальнага сектара эканомікі быў улічаны. У БДУ ў 2013 годзе адкрыецца адразу 7 новых спецыяльнасцяў, падрыхтоўка па якіх раней у беларускіх ВНУ не вялася: «Гідраметэаралогія», «Касмааэракартаграфія», «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі», «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Ядзерныя фізіка і тэхналогіі», «Хімія лекавых злучэнняў» і «Хімія высокіх энергій». Сярод «навінак» прыёмнай кампаніі ў БДУІР — «Эканоміка электроннага бізнесу», «Электронны маркетынг», «Праграмаваныя мабільныя сістэмы» і іншыя. А ў Міжнародным гуманітарным экалагічным універсітэце адкрываецца спецыяльнасць «Медыцынская фізіка». Усяго ў Агульнадзяржаўны класіфікатар «Спецыяльнасці і кваліфікацыі» было ўключана больш як 30 новых спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі першай ступені.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ТРЫ ГАДЗІНЫ — НА АПОШНІЯ ПАДЛІКІ

Што да рэжыму работы прыёмных камісій, у вызначаныя правіламі прыёму тэрміны прыёмныя камісіі будуць працаваць з панядзелка па суботу з 9.00 да 18.00. А калі апошні дзень прыёму дакументаў, здачы ўступных іспытаў ці залічэння абітурыентаў прыпадзе на нядзелю, прыёмная камісія будзе працаваць таксама і ў гэты дзень з 9 раніцы да 18 гадзін.

Такім чынам, сёлета прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства абароны і Пагранкамітэта будуць працаваць па суботах 13 і 20 ліпеня і ў нядзелю 21 ліпеня.

Прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства культуры будуць працаваць па суботах 13, 20 і 27 ліпеня, а таксама дзве нядзелі — 14 і 21 ліпеня (у выпадку правядзення ў гэтыя дні ўступных іспытаў па творчасці).

Прыёмныя камісіі ВНУ другога патоку будуць працаваць па суботах 20, 27 ліпеня, 3 жніўня і ў нядзелю 4 жніўня (апошні дзень прыёму дакументаў на платнай аснове).

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца штодня кожныя тры гадзіны: а 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне! У абітурыентаў будзе ўсяго тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам ВНУ або спецыяльнасці. У апошні дзень прыёму дакументаў допуск абітурыентаў у будынак навучальнай установы, у якой размешчана прыёмная камісія, спыніцца а 18 гадзіне. У гэты ж час прыёмная камісія таксама спыніць выдачу абітурыентам дакументаў з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць, пры гэтым будзе ажыццяўляцца прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, якія паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

■ Людзі ад зямлі і працы

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПРЫГОДНАСЦЬ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ



Жыхары вёскі Губарэвічы Хойніцкага раёна Марыя Дашук і Мікалай Рудзянок пабілі рэкорды прафесійнага працалюбства: у кожнага з іх працоўны стаж перавышае 60 гадоў. Працоўную кніжку, у якой толькі адзін запіс, Марыі Данілаўне аддалі на памяць у 2008-м пасля 65 гадоў, адпрацаваных ёю на карысць дзяржавы. Мікалая Нікіфаравіча выправілі на пенсію ў канцы мінулага года з 68 гадамі стажу. Хто ведае, каб не раптоўная хвароба, можа, і дагэтуль ветэран працы круціў бы баранку саўгаснага аўто?

Яны нарадзіліся ў далёкім 1930-м і ўсё жыццё пражылі добрымі суседзямі — і да вайны, і ў час яе, і цяпер, калі з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС вёска Губарэвічы атрымала статус выселенай. Вельмі рана скончылася некалі іхняе суседскае дзяцінства, паклаўшы на кволыя плечы ўвесь цяжар пасляваеннага сялянскага жыцця.

Нездарма кажуць, што дзеці вайны сталеюць вельмі рана. У лістападзе 1943-га, калі вёску вызвалілі ад нямецкіх захопнікаў, 13-гадовыя суседзі адначасова пачалі свае працоўныя біяграфіі. Дарэчы, як і тысячы іншых дзяцей вайны, яны нараўне з дарослымі ішлі ў калгасы збіраць бульбу, вырошчваць лён, садзіць капусту і тытунь. Пазней Марыю ўзялі рабочай КЗС, а Мікалаю даверылі працаваць на запрэжаных валах. Пасля службы ў арміі Мікалай Рудзянок скончыў шафёрскія курсы і паўстагоддзя «з хвосцікам» катаўся па дарогах саўгаса «Стралічава». А суседка і швагерка Марыя Дашук так і засталася на зернесушылцы клапаціцца пра хлеб. Але найбольш здзіўляе не той іхні працоўны пачатак у галодным 1943-м, а менавіта гэтыя 20 з гакам гадоў, адпрацаваныя Марыяй Данілаўнай і Мікалаем Нікіфаравічам у пенсійным узросце, калі большасць людзей аддалі б перавагу бесклапотнаму жыццю. Тым больш што нашы героі мелі права на датэрміновую пенсію.

«З працы нас ніхто не гнаў — наадварот, прасілі папрацаваць яшчэ і яшчэ. А мы ніколі не былі супраць», — кажуць і ўсміхаюцца па-ранейшаму добрыя і працавітыя суседзі — двое з сямі жыхароў Губарэвічаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

**<u>На фотаздымку:</u> М. Дашук і М. Рудзянок з працоўнымі кніжкамі, якія заслугоўваюць стаць важнымі экспанатамі музея працоўнай славы.**

*Хойніцкі раён*

■ Кватэрнае пытанне

# КАМУ КАМЕРЦЫЙНАЕ ЖЫЛЛЁ?

**Летась у рэспубліцы стала выдзяляцца дзяржаўнае арэнднае жыллё. Падкажыце, хто мае права на яго атрыманне ў першую чаргу і па-за чаргой? Ці ёсць перавагі пры яго прадастаўленні ў тых, хто знаходзіцца на кватэрным уліку?**

**Г. Смоліч,**
*г. Гомель*

Дзейнае заканадаўства і новы Жыллёвы кодэкс не змяшчаюць нормаў аб прадастаўленні грамадзянам права на пазачарговае або першачарговае атрыманне жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2011 г. № 512 «Аб некаторых пытаннях выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду» парадак выдзялення грамадзянам жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання вызначаецца рашэннямі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі арганізацый, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца гэтыя жылыя памяшканні.

Разам з тым указ змяшчае і пэўныя патрабаванні, якія павінны захоўвацца пры выдзяленні жылля камерцыйнага выкарыстання.

Так, вычарпальная інфармацыя аб наяўнасці такіх жылых памяшканняў і аб тэрміне звароту грамадзян па атрыманне іх у карыстанне на ўмовах адпаведнага дагавора найму жылога памяшкання павінна размяшчацца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама арганізацыямі, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца такія жылыя памяшканні, у даступных для азнаямлення месцах і ў інтэрнэце на афіцыйных сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па месцы знаходжання гэтых жылых памяшканняў.

Указаны тэрмін звароту грамадзян не можа быць устаноўлены менш чым 15 каляндарных дзён з дня размяшчэння адпаведнай інфармацыі. Пасля заканчэння вызначанага тэрміну разглядаюцца заявы і выдзяляюцца жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання грамадзянам, якія маюць пераважнае права, знаходзяцца на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (у парадку чарговасці, зыходзячы з даты пастаноўкі іх на ўлік, у тым ліку і па месцы працы). У выпадку адсутнасці заяў грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання выдзяляюцца асобам, якія не знаходзяцца на такім уліку (у парадку чарговасці паступлення заяў).

**Віктар САВІЦКІ**

■ Нерухомасць

# РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖФОНДУ АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ ПАЎПЛЫВАЕ НА КОШТ НАЙМУ ПРЫВАТНЫХ КВАТЭР

**Такое меркаванне выказала ў размове з карэспандэнтам БЕЛТА намеснік дырэктара па арэндзе жылля агенцтва нерухомай маёмасці «Твая сталіца» Валянціна СЯНЧЫХІНА.**

Эксперт лічыць, што развіццё ў Беларусі дзяржаўнага фонду арэнднага жылля паўплывае на прыватны рынак найму жылой нерухомай маёмасці: калі дзяржаўнае здымнае жыллё будзе ўзводзіцца ў дастатковай колькасці, а здавацца па больш нізкай цане, то кошт арэнднай платы ў прыватнікаў таксама папаўзе ўніз.

Валянціна Сянчыхіна выказала думку, што гэта перспектыўны напрамак і нараўне з купляй або будаўніцтвам кватэры з'яўляецца для грамадзян добрай магчымасцю абзавесціся дахам над галавой, тым больш, калі ў перспектыве можна будзе выкупіць такую кватэру ў дзяржавы. «Несумненна, гэта стане вырашэннем жыллёвага пытання асабліва для тых маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, хто гадамі стаіць на ўліку, мае права на атрыманне льготнага крэдыту, але не мае дастатковых фінансавых магчымасцяў, каб пабудаваць або набыць жыллё. Аднак гэта магчыма пры ўмове, што арэндная плата будзе даступнай», — сказала намеснік дырэктара кампаніі.

Разам з тым, паводле слоў Валянціны Сянчыхінай, забяспечыць усіх, хто сапраўды мае патрэбу ў арэндным жыллі, немагчыма. Значную долю сярод тых, хто шукае здымную кватэру, займаюць маладыя сем'і, якія хочуць жыць асобна ад бацькоў, хоць у тых ёсць кватэры, і пары, якія не знаходзяцца ў афіцыйным шлюбе, але прынялі рашэнне з'ехацца і жыць разам. «Такіх у нас каля 70 працэнтаў у агульным аб'ёме жадаючых. А яшчэ прыезджыя грамадзяне, студэнты і абітурыенты, якія, зразумела, яшчэ не стаяць на ўліку маючых патрэбу, таму рынак прыватнага арэнднага жылля ўсё роўна будзе існаваць і далей, толькі цана, магчыма, стане крыху ніжэйшай за кошт канкурэнцыі, якую можа скласці дзяржаўны фонд арэнднага жылля», — падкрэсліла яна.

**Калі дзяржаўнае здымнае жыллё будзе ўзводзіцца ў дастатковай колькасці, а здавацца па больш нізкай цане, то кошт арэнднай платы ў прыватнікаў таксама папаўзе ўніз.**

Гаворачы аб попыце на здымныя кватэры на прыватным рынку арэнды жылля, спецыяліст адзначыла, што сёння попыт значна перавышае прапанаванне. У Беларусі, як і ў многіх іншых краінах свету, арэнда кватэр мае сезонны характар: восенню мінулага года попыт у Мінску перавышаў прапанаванне прыкладна ў пяць разоў, цяпер ажыятаж крыху спаў, але попыт усё роўна ў два-тры разы вышэйшы. «Цяпер прапанавання стала менш і ў сувязі з тым, што ў краіне ўводзіцца забарона на здачу ў арэнду кватэр, якія пабудаваны з прыцягненнем ільготнага крэдыту. Але разам з тым з сярэдзіны ліпеня традыцыйна пачнецца чарговы бум на здымныя кватэры, які, як правіла, выклікае павелічэнне кошту арэнды», — сказала Валянціна Сянчыхіна, падкрэсліўшы, што ў гэтым выпадку нарошчванне аб'ёмаў будаўніцтва арэнднага жылля і павелічэнне фонду за кошт тых кватэр, якія ўжо ёсць, можа ў пэўнай меры перашкодзіць значнаму павелічэнню арэнднай платы за пражыванне ў прыватным здымным жыллі.

Што датычыцца тыпалогіі кватэр, неабходных для фарміравання фонду дзяржаўнага арэнднага жылля, эксперт выказала думку, што найбольш прымальным варыянтам будуць дамы з максімальнай колькасцю двух- і трохпакаёвых кватэр. «На рынку арэнднага жылля найбольшым попытам карыстаюцца аднапакаёвыя кватэры, затым па запатрабаванасці ідуць двухпакаёвыя кватэры, трох- і чатырохпакаёвыя карыстаюцца найменшым попытам. А паколькі дзяржаўнае арэнднае жыллё будзе прадастаўляцца ў першую чаргу грамадзянам, якія ўжо доўгі час стаяць на ўліку маючых патрэбу, а гэта, як правіла, сем'і з дзецьмі, якія часцей за ўсё прэтэндуюць на кватэры вялікім метражом, то і будаваць адпаведна трэба дамы з двух- і трохпакаёвымі кватэрамі. Да таго ж дагавор з такімі сем'ямі прадугледжваецца заключаць не на год і не на два, а на працяглы тэрмін, таму і ў будаўніцтве арэнднага жылля дзяржаве трэба глядзець на далейшую перспектыву», — растлумачыла прадстаўнік прыватнага агенцтва нерухомай маёмасці

■ Чалавек — чалавеку

# АГОНЬ НЕ ПАВІНЕН ПАТУХНУЦЬ!

**...Маю прабабулю Ефрасінню ў вёсцы звалі Прузынкай. Была яна, як расказвалі, невялічкай прыгожай дзяўчынай, а вось замуж ішла за маўклівага, нашмат старэйшага волата па імені Якаў. Няроўны шлюб? Напэўна, таму нявеста дужа хвалявалася! Хвалявалася так, што падчас вянчання не ўтрымала свечку...**

Святар падняў яе з падлогі, падаў у рукі маладой. Што цікава — агеньчык пры гэтым не пагас, роўненька гарэў сабе далей!

Прузынка з Якавам пражылі свой век у цяжкай працы, а яшчэ — у любові і згодзе. На шчасце, той чароўны агеньчык яны змаглі перадаць сваім нашчадкам. Адна з іх — мая бабуля Лідзія Якаўлеўна Стрыжнёва. Цяпер ёй 95-ы год. Але яна, нягледзячы на гэта, можа (калі не адабраць рыдлёўку) ускапаць граду, пасадзіць цыбульку, гурочкі, насеяць кветак.

А ўсё дзеля чаго? Дзеля таго, каб не пуставала зямелька і каб кожны, хто будзе праходзіць міма яе гародчыка, мог палюбавацца, пацешыцца краскамі... Да таго ж не можа яна без працы, без нейкага занятку! Таму даглядаць пасевы таксама імкнецца сама — выносіць з хаты маленькую табурэтку, садзіцца, пачынае палоць, рыхліць... Шчыруе, аж пакуль не прыйдзе мама (балазе, мы жывём паблізу).

...Мусіць, у кожнага ў жыцці ўзнікаюць нейкія складанасці. Не ведаю, як іншыя, а я тады ўспамінаю сваю прабабулю Ефрасінню, бабулю Лідзію Якаўлеўну, якая перажыла Другую сусветную вайну, узгадваю матулю і пачынаю верыць, што мне проста наканавана ўсё перамагчы!

Яшчэ і для таго, каб той чароўны агеньчык працавітасці і любові да людзей перадаць далей.

**Вольга АНІКІЕВІЧ**

■ Ёсць пытанне

# АЎТОБУСЫ ПРАХОДЗЯЦЬ, АЛЕ... НЕ СПЫНЯЮЦЦА

**Гэты ліст у рэдакцыю шаноўнай «Звязды» я пішу ад імя жыхароў старажытнага мястэчка Вішнявец.**

Цяпер гэта вёска, але ж вёска вялікая. Праз яе штодзень праходзяць маршруткі з Пінска ў Мінск, з Мінска ў Пінск, а таксама аўтобус Альшаны—Мінск. Здавалася б, гэта добра, і з транспартам у месцічаў — ніякіх праблем!

Не спяшайцеся гэтак думаць, бо названыя аўтобусы праз наш Вішнявец толькі праходзяць, але... не спыняюцца — білет трэба браць аж да Нясвіжа. Узнікае пытанне, навошта?

Неаднойчы мы задавалі яго адзін аднаму і кіроўцам аўтобусаў. Яны вітаюць задуму зрабіць прыпынак у Вішняўцы...

Хочацца верыць, што супраць яго не будзе і кіраўніцтва аўтавакзала «Усходні», чыноўнікі з міністэрства транспарту. А ўжо як ім будуць удзячны людзі, якія едуць з Мінска ў Вішнявец і ваколіцы, з Нясвіжа ў Стоўбцы!..

Спадзяёмся, што наш голас будзе пачуты.

**Іван Іванавіч КАЗЛОЎСКІ**
**і яго землякі.**

*г. Мінск*

■ Стыхія

# ГРАД І ПАЖАР АД МАЛАНКІ

**Падчас навальніц, якія суправаджаліся парывамі ветру да 21 метра за секунду, у панядзелак, згодна са звесткамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пацярпела 48 населеных пунктаў. Былі пашкоджаны дахі 95 жылых дамоў, трох аб'ектаў сацкультбыту, аднаго вытворчага і 70 сельскагаспадарчых.**

У раёне метэастанцыі Слуцк з 15.55 па 16.03 назіраўся град дыяметрам 20 міліметраў. На шчасце, пацярпелых не было. А вось у вёсцы Обчын Любанскага раёна разрад маланкі нарабіў шкоды. Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, паведамленне пра пажар у доме, які выкарыстоўваўся пад лецішча, паступіў у 16.29. Калі прыбылі выратавальнікі, яны ўбачылі дах будынка, што палае адкрытым полымем. Людзей у доме не было. У выніку здарэння агонь знішчыў дах па ўсёй плошчы драўлянага жылля.

З 6 гадзін ранку панядзелка да 6 гадзін аўторка, паводле звестак «Белэнерга», на тэрыторыі краіны былі абясточаны 833 населеныя пункты, 120 сельскагаспадарчых будынкаў, амаль 2,5 тысячы трансфарматарных падстанцый, пашкоджаны 184 лініі электраперадач. Адключэнні аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# КАБ ПАРАЖНЯКОМ НЕ ЕЗДЗІЦЬ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У балансе паслуг рэспублікі аўтатранспарт летась сфарміраваў другое па аб'ёме (пасля трубаправоднага) дадатнае сальда — 670,4 млн долараў, альбо амаль чвэрць дадатнага сальда паслуг краіны (24%). 93% паступленняў ад аўтатранспарту забяспечана грузавымі перавозкамі. Нічога дзіўнага для краіны з такім геаграфічным становішчам — на перакрыжаванні асноўных міжнародных шляхоў зносін. Акрамя таго, гандлюем мы з вялікай колькасцю краін. Аднак ад праблем геаграфія не страхуе. Чаго не хапае беларускім аўтаперавозчыкам для яшчэ больш эфектыўнай працы? Чаму многія машыны вяртаюцца на радзіму паражняком? Хто з'яўляецца галоўным канкурэнтам Беларусі ў перавозках? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся нядаўна ў Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (БАМАП).**

## СТАТЫСТЫКА

Па выніках 2012 года аб'ём экспартнай выручкі паслуг аўтамабільнага транспарту перавысіў 1 млрд долараў ЗША (рост на 13,6% да ўзроўню 2011-га). Дарэчы, упершыню паслугі аўтатранспарту па гэтым паказчыку занялі першае месца сярод усіх відаў паслуг нашай краіны, што пастаўляюцца на экспарт.

Па экалагічнай структуры больш за 50% аўтатранспартных сродкаў беларускіх перавозчыкаў адпавядае высокім стандартам Еўра-4 і Еўра-5. Па выніках 2012 года доля новых аўтатранспартных сродкаў з тэрмінам эксплуатацыі «да 3-х гадоў» склала 37% — максімальнае значэнне за апошнія 20 гадоў.

## МАЛЫ НЕ ЗНАЧЫЦЬ СЛАБЫ

Лічбы добрыя, асабліва калі ўлічыць, што асноўны іх аб'ём выканаў мікра- і малы бізнес. «93% ад агульнай колькасці прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у склад нашай Асацыяцыі, — менавіта такія прадпрыемствы, — заявіў **Мікалай БАРАВЫ, старшыня БАМАП**. — Буйных у нас вельмі мала — 2%. Калі глядзець на аўтапарк грузаперавозчыкаў, то 87% аўтамабіляў трымаюць у сваіх руках мікра-, малыя і сярэднія арганізацыі». Маленькія прадпрыемствы дасягаюць сярэднегадавога прабегу 240 тысяч кіламетраў. «А гэты ўзровень не ніжэйшы, чым у лепшых прадпрыемстваў Заходняй Еўропы», — кажа спецыяліст.

Выклікае павагу тое, што кіраўнікі падобных прадпрыемстваў пачынаюць з нуля. Самі могуць спачатку быць кіроўцамі, праходзяць пэўную школу. «Яшчэ больш радуе, што такія арганізацыі знаходзяцца не ў сталіцы, а ў рэгіёнах. А гэта спрыяе развіццю рэгіянальнай эканомікі», — лічыць Мікалай Баравы.

## ПАТРАБУЮЦЬ ПАШЫРЭННЯ

«Ад нас увесь час патрабуюць пашырэння. Але ж ёсць праблемы, якія не дазваляюць нарошчваць абароты. Нам перашкаджаюць квоты на перавозкі грузаў у міжнародных зносінах. Паміж дзвюма краінамі ў перавозках амаль няма цяжкасцяў. Праблемы з перавозкамі ў трэція краіны. Дазволы даюць магчымасць больш эфектыўна працаваць з транспартным сектарам і з найменшымі выдаткамі. Уявіце сабе, што загрузілі машыну ў Партугалію. Туды з Беларусі машына едзе з грузам. А назад даводзіцца паражняком ехаць. У выніку 25% нашага транспарту выконвае перавозкі менавіта паражняком. А дазволы дадуць магчымасць заехаць, напрыклад, у Іспанію і ўзяць груз, каб прывесці ў Беларусь ці іншую краіну», — агучвае праблемы старшыня БАМАП.

Між іншым, Беларусь — краіна, якая вітае лібералізацыю ў сферы грузаперавозак. «Мы выдаём універсальныя дазволы, якія даюць магчымасць замежнаму транспарту проста заязджаць да нас, грузіцца і ехаць з нашым грузам кудысьці яшчэ. 26% перавозак па тэрыторыі Беларусі выконваюцца замежнымі кампаніямі. Мы не ствараем праблем па такіх перавозках. І просім іншыя краіны, каб яны мелі такі самы падыход да нашых перавозчыкаў».

Аднак адгукнуцца на такі заклік, па словах Мікалая Баравога, не хочуць нават самыя блізкія партнёры. Уявіце сабе, што груз едзе на Урал. Назад хацелася б узяць груз да Масквы па дарозе дадому. «А расіяне нам кажуць, што так рабіць нельга, бо гэта прыярытэты расійскага транспарту. Але эканамічны эфект ад супрацоўніцтва быў бы цікавы і нам, і Расіі. Мы ж гатовыя даваць такія ж дазволы расіянам на сваёй тэрыторыі. Чаму не? Прычым мы прапануем свае паслугі па больш нізкіх цэнах, што можа ў далейшым паўплываць на цану тавару, а гэта будзе добра для людзей».

## ПАЛЯКАМІ І ЛІТОЎЦАМІ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў разам з Міністэрствам транспарту і камунікацый Беларусі шмат працуе над павелічэннем колькасці дазволаў для беларускіх перавозчыкаў на праезд па тэрыторыях замежных краін, у тым ліку па дэфіцытных кірунках. За мінулы год дадаткова ўзгоднена і атрымана 38765 дазволаў. Ідзе праца па лібералізацыі існуючай дазвольнай сістэмы па шэрагу кірункаў, у тым ліку ў межах Адзінай эканамічнай прасторы, бо гэта абмяжоўвае магчымасць выканання перавозак грузаў аўтатранспартам і не адпавядае прынцыпам інтэграцыі эканамічных сістэм трох дзяржаў. Сёлета істотныя зрухі адбыліся ў працэсе ўдасканалення дазвольнай сістэмы Беларусі ў перамовах з Казахстанам: 25 красавіка быў падпісаны пратакол, які ўносіць змяненні ў дзейнае міжурадавае беларуска-казахстанскае пагадненне аб міжнародных аўтамабільных зносінах ад 2004 года. Дакумент накіраваны на паэтапнае зняцце абмежаванняў, звязаных з дзеяннем дазвольнай сістэмы ва ўзаемаадносінах з Казахстанам і ў межах АЭП у цэлым. Пасля правядзення неабходных працэдур дазвольная сістэма будзе адменена ў абедзвюх краінах. Далей яны будуць шукаць прававое рашэнне для зняцця абмежаванняў на перавозкі грузаў у/з трэціх краін. Працягваецца праца з расійскім і казахстанскім бакамі па ўдасканаленні дазвольнай сістэмы ў трохбаковым фармаце.

**«Уявіце сабе, што загрузілі машыну ў Партугалію. Туды з Беларусі машына едзе з грузам. А назад даводзіцца паражняком ехаць. У выніку 25% нашага транспарту выконвае перавозкі менавіта паражняком. А дазволы дадуць магчымасць заехаць, напрыклад, у Іспанію і ўзяць груз, каб прывесці ў Беларусь ці іншую краіну».**

**Андрэй СМАЛЯР, старшыня савета дырэктараў «Інтэртрансаўта», пераможца конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2012 года ў Мінскай вобласці» ў сферы аказання транспартных паслуг,** таксама выказваецца за свабоду перавозак і называе асноўнай праблемай адсутнасць дазволаў. Ён жа ўказвае на тое, што беларускія перавозчыкі «маюць вялікую канкурэнцыю з боку польскіх і літоўскіх калег. Яны валодаюць агульным паркам больш чым у 200 тысяч аўтамабіляў. Яны маюць доступ да еўрапейскіх крэдытных рэсурсаў са стаўкамі не болей 5%. І самае галоўнае — яны атрымалі летась ад Расійскай Федэрацыі беспрэцэдэнтную ў гісторыі, фактычна неабмежаваную колькасць дазволаў па перавозках. Мы, на жаль, не можам карыстацца такімі прывілеямі. Хоць і маем высокакваліфікаваны персанал».

## ПАЗІЦЫЯ МІНТРАНСА

Мінтранс лічыць, што лібералізацыя адцягваецца нашымі партнёрамі. Карэспандэнт «Звязды» аб гэтай праблеме пагутарыў асабіста з **Сяргеем ДУБІНАМ, намеснікам начальніка ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці і дазвольнай дзейнасці Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі.**

***— І вы, і перавозчыкі шмат наракаеце на тое, што Расія і іншыя краіны не даюць нам дазволы на перавозкі іх грузаў, каб не ездзіць паражняком. Чым яны гэта матывуюць?***

— Яны матывуюць гэта тым жа, чым і мы, — абаронай свайго рынку, інтарэсаў сваіх перавозчыкаў, бо самае галоўнае для іх, як і для нас, — развіццё свайго транспарту. Нашы перавозчыкі (гэта не сакрэт) больш канкурэнтаздольныя. У нас і транспарт больш абноўлены, і кіроўцы больш адказныя. Таму выгада ў прыцягненні нашых перавозчыкаў ёсць. Магчыма, яны баяцца, што нашы беларускія перавозчыкі запоўняць іх рынак.

***— А чаму тады польскія і літоўскія перавозчыкі атрымалі дазволы на перавозкі ў Расії (такі факт агучваўся на прэс-канферэнцыі)? Чаму іх пускаюць, а нас не?***

— Гэта я ўжо пракаментаваць не магу. Я не магу залезці ў галовы расіян.

***— Што гэта значыць: яны нам не давяраюць, ці што?***

— Не, я не магу сказаць канкрэтна. Нельга сказаць, што яны літоўскім і польскім перавозчыкам адкрылі цалкам рынак. Яны ім далі двухбаковыя перавозкі. Проста яны трактуюць двухбаковыя перавозкі інакш, чым яны трактуюцца паміж намі. А па сутнасці, колькасць дазволаў у нас не такая і малая. Але ж мы працуем над тым, каб зусім адысці ад дазвольнай сістэмы.

## КАНКУРЭНЦЫЯ ПАДШТУРХОЎВАЕ

Мікалай Баравы пастаянна звяртае ўвагу на тое, што аўтамабільны транспарт працуе ў вельмі жорсткай канкурэнцыі: «Калі ты маеш добрую дзелавую рэпутацыю, фінансавую ўстойлівасць, сучасны рухомы састаў, прафесіянальныя кадры, — толькі тады ты маеш права канкурыраваць з астатнімі. Калі ласка — даказвай, што ты лепшы».

Узмацненне канкурэнцыі на рынку аўтамабільных грузаперавозак падштурхоўвае беларускіх перавозчыкаў да актыўных дзеянняў па паляпшэнні ўмоў для прафесійнай дзейнасці. Такія дзеянні накіраваны, у першую чаргу, на ўдасканаленне сістэмы падрыхтоўкі кадраў для аўтапрадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі па грузаперавозках, мытнага кантролю, спрашчэння візавых фармальнасцяў. Дарэчы, у 2011 годзе спецыялізацыя «Кіроўца аўтамабіля (міжнародныя перавозкі)» нарэшце была ўнесена ў Агульнадзяржаўны класіфікатар «Прафесіі рабочых і пасады служачых». Гэта дазволіла пачаць падрыхтоўку неабходных кадраў.

## ІНШЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Да іх можна аднесці эфектыўнасць. Перавозчыкам вельмі перашкаджаюць прастоі. Для таго, каб іх не было, патрэбна дакладная і хуткая праца мытні.

Спрэчкі ідуць і вакол транспартных цэхаў на прадпрыемствах. Сяргей Дубіна лічыць, што яны — перажытак савецкага часу: «Кожны павінен займацца сваёй справай». Прафесіянальныя перавозчыкі могуць зрабіць усё больш танна і хутка. У выніку будзе зніжацца цана на тавар.

Увод жа аплаты за некаторыя дарогі ў Беларусі з 1 ліпеня гэтага года значна не паўплывае на грузаперавозкі, лічыць чыноўнік. Бо гэта будуць дарогі еўрапейскага ўзроўню. Мікалай Баравы таксама не супраць платных дарог, бо перавозчыкі прызвычаіліся плаціць у Еўропе за добрыя дарогі. Хоць ён і сцвярджае, што выдаткі на аплату праезду павялічваюцца.

## ЧАМУ Ў МІЖНАРОДНЫХ ПЕРАВОЗКАХ ТАК МАЛА «МАЗАЎ»?

Старшыня БАМАП заявіў, што «айчынная тэхніка займае прыблізна каля 13% сярод транспартных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў міжнародных перавозках. Гэта аўтамабілі вытворчасці нашага МАЗа. У асноўным гэтыя аўтамабілі выкарыстоўваюцца ў перавозках у краіны Усходняй Еўропы, у суседнія краіны, у Расію, ва Украіну, але ў далёкіх маршрутах выкарыстоўваюцца аўтамабілі іншых марак. Гэта звязана з сэрвісам гэтых аўто, а таксама з некаторымі параметрамі, якія зніжаюць выдаткі беларускіх перавозчыкаў. За неэкалагічныя машыны даводзіцца ў Еўропе шмат плаціць».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Праверана на сабе

# ВЫ ІМ — АЎТО, ЯНЫ ВАМ — ГРОШЫ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Прыяцель, які пару разоў выручаў «коламі», каб адвезці ў райцэнтры, што непадалёку ад Віцебска, папрасіў скласці кампанію, каб разам здаць яго аўто... у ламбард. Чужое, вядома, не шкада, але адразу ўзнікла пытанне: ці варта расставацца з любімай машынай, калі раптам спатрэбіліся грошы?**

Аўтамабільныя ламбарды ў Беларусі па сутнасці сваёй дзейнасці нічым не адрозніваюцца ад звычайных ламбардаў: нешта каштоўнае прынёс (у нашым выпадку — на каштоўным прыехаў), і за гэта вам выдадуць энную суму грошай. Вось толькі колькі дадуць — гэта ўжо зусім іншае пытанне.

Арганізацыя, якая аказвае такія паслугі, заключае з вамі дагавор. І ў гэтым дакуменце абавязкова прапішуць абумоўленую суму і тэрмін, на працягу якога вы давяраеце свой заклад для захоўвання.

Памер працэнтнай стаўкі крэдытавання, як правіла, не перавышае 20%, а «стартуе» з 7%. Вельмі часта памер стаўкі — каля 10%.

Калі ваш старэнькі аўтамабіль ацанілі, напрыклад, у 20 мільёнаў рублёў і не абмянялі на грошы — не здзіўляйцеся. Каштаваць аўтамашына павінна не менш за 4 тысячы долараў у эквіваленце. Як правіла, сёння ў ламбардзе прымаюць аўто, якія сышлі з канвеера не пазней за 1996-1997 гады. У аўтамабільных ламбардах часцей за ўсё выдаюць на рукі суму, якая не перавышае 50-70% ад рэальнага кошту машыны.

Якія дакументы неабходна мець пры сабе? Перш за ўсё — пашпарт уладальніка альбо даверанай асобы і тэхнічны пашпарт аўтамабіля, страхоўка, пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку і даверанасць (калі машынай карыстаюцца па даверанасці). Звычайна ўся працэдура атрымання крэдыту пад заклад аўто працякае без цяганіны непасрэдна ў ламбардзе.

У адным з ламбардаў растлумачылі нюансы: «Калі вы — уласнік машыны, неабходна ажыццявіць пераафармленне даверанасці на аўто на работніка арганізацыі, якой належыць ламбард. Затым аўтамабіль здымаецца з уліку ў дзяржаўнай аўтаінспекцыі. Потым яе трэба пакінуць на ахоўнай аўтамабільнай стаянцы, якую арандуе аўтамабільны ламбард.

У выніку пасля ўсяго вышэйпералічанага вы можаце быць упэўнены ў тым, што вам уручаць абумоўленую ў дагаворы суму. Але трэба ведаць, што гэтыя ўмовы тычацца сумы да 70% кошту машыны. Калі ж вам патрэбен крэдыт у памеры, які не перавышае, напрыклад, 50% кошту машыны, то вы атрымаеце грошы хутчэй, бо машыну не трэба будзе здымаць з уліку ў дзяржаўнай аўтаінспекцыі, а спатрэбіцца толькі заключэнне дагавора. Пасля таго, як дагавор будзе падпісаны, атрымлівайце грошы ў доўг.

Паводле слоў спецыялістаў, можна, дарэчы, атрымаць у ламбардзе грошы «пад машыну» нават калі вы ёю не валодаеце, а толькі маеце даверанасць. Але ў любым выпадку работнікі ламбарда пастараюцца знайсці гаспадара машыны. Калі не атрымаецца, вам «свеціць» не больш як 30% ад кошту машыны.

**УМОВЫ КРЭДЫТАВАННЯ:**

- Кошт машыны павінен быць не менш за 4 тысячы умоўных адзінак, дата вытворчасці не раней за 1997 год;
- Сума пазыкі складае ад 50% да 70% ад рынкавага кошту аўтамабіля;
- Мінімальная сума пазыкі складае ад 2 тысяч у.а. па курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень выдачы пазыкі і залежыць ад тэхнічнага стану, узросту аўтамабіля;
- Тэрмін пазыкі — ад 15 дзён да 12 месяцаў;
- У выпадку нявыплаты пазыкі і працэнтаў аўтамабіль будзе прададзены.

Бярэцца асобная плата за выкарыстанне грошай. Яна залежыць ад колькасці дзён, месяцаў, на якія вы захацелі ўзяць грошы ламбарда, пакінуўшы ў заклад аўтамабіль.

У прыватнасці, па ўмовах абслугоўвання кліентаў у адным з ламбардаў, калі вы плануеце вярнуць грошы з працэнтамі на працягу месяца, памер аплаты за крэдытную падтрымку не перавысіць 9% ад сумы, атрыманай вамі... Калі ж час крэдытавання пад заклад аўтамабіля — квартал і больш, памер аплаты будзе на ўзроўні 7% ад атрыманай вамі сумы.

А калі, не дай Бог, пакуль машына ў закладзе, з ёй што-небудзь здарыцца? Не хвалюйцеся, бо ламбард адказвае за тое, каб вярнуць вам машыну ў такім жа выглядзе, у якім яна была здадзена на захоўванне.

Калі тэрмін крэдытавання мінуў, а вы не змаглі разлічыцца з ламбардам, машыну прададуць.

**СУМЕСНЫ ПРОДАЖ**

Параўнальна нядаўна на беларускім рынку з'явілася новая паслуга ад аўтамабільных ламбардаў — «Сумесны продаж аўто», скарыстаўшыся якой можна атрымаць за машыну больш за 90% рынкавага кошту.

Як гэта зрабіць? Вы прыязджаеце на машыне і з неабходнымі дакументамі заходзіце ў аўталамбард, дзе афармляеце пазыку пад аўтамабіль на суму 50-70% ад яго кошту. Гэтыя грошы атрымліваеце на рукі адразу. Аўтамабіль выстаўляецца на продаж у аўтасалоне за 100% яго рынкавага кошту. У ламбардзе бяруць на сябе яго перадпрадажную падрыхтоўку, а таксама рэкламу ў СМІ, што дасць магчымасць прадаць яго максімальна хутка і выгадна. Як толькі прадаецца машына, вы атрымліваеце астатнюю суму ад яе продажу (мінус камісія ламбарда і працэнты па крэдыце). Рэальны прыклад: рынкавы кошт аўтамабіля — 8 тысяч долараў. Вы адразу атрымліваеце на рукі амаль 6 тысяч у выглядзе пазыкі, са стаўкай 3,5%. Калі вашу машыну купяць на працягу 2 тыдняў, агульны ваш даход ад яе продажу складзе роўна 7554 умоўныя адзінкі.

У любым выпадку выходзіць, што першапачаткова набываць машыну выгадна, калі яна не вельмі старая. Калі будуць праблемы з грашыма, можна даволі хутка атрымаць за яе круглую суму ў ламбардзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■


**СООО «Барпромэкс» извещает
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества, принадлежащего
СООО «Барпромэкс», расположенного по адресу:
г. Гомель, ул. Объездная, 9**

(сообщение о предыдущем аукционе – в газете «Рэспубліка» от 22.03.2013 г.)

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, руб. | Задаток 10%, руб. |
|---|---|---|---|
| 5 | Станок отрезной, инв. № 1/12 | 18 600 000 | 1 860 000 |
| 8 | Станок отрезной, инв. № 1/15 | 1 950 000 | 195 000 |
| 12 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/24 | 3 594 000 | 359 400 |
| 15 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/27 | 3 594 000 | 359 400 |
| 16 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/28 | 3 594 000 | 359 400 |
| 17 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/29 | 3 594 000 | 359 400 |
| 18 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/30 | 3 594 000 | 359 400 |
| 19 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/31 | 3 594 000 | 359 400 |
| 20 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. № 1/32 | 3 594 000 | 359 400 |
| 21 | Станок фрезерный для фрезерования отверстий, инв. №1 /33 | 3 594 000 | 359 400 |
| 22 | Станок сверлильно-клеймовый, инв. № 1/34 | 22 980 000 | 2 298 000 |
| 23 | Зигмашина ИВ 2714, инв. № 15 | 20 580 000 | 2 058 000 |
| 26 | Щепкодробильная установка, инв. № 1/07 | 30 360 000 | 3 036 000 |
| 27 | Пилорама РК 3217 (линия по распиловке древесины), инв. № 2809 | 41 280 000 | 4 128 000 |
| 30 | Станок лентопильный 1/09 | 9 360 000 | 936 000 |
| 32 | Станок лентопильный 1/11 | 9 360 000 | 936 000 |
| 33 | Гидравлический пресс гибки барабанов, инв. № 1/08 | 420 000 | 42 000 |
| 36 | Штамп 00-001 Фланец | 300 000 | 30 000 |
| 37 | Штамп 00-002 Фланец | 300 000 | 30 000 |
| 38 | Окорочный станок с расклинивающими ножами и подающий транспортер (линия по распиловке древесины) | 58 980 000 | 5 898 000 |
| 39 | Рольганг (7 п.м.), инв. № 2/02 | 8 640 000 | 864 000 |
| 40 | Пневмогвоздобой С33/90-А-2 | 2 760 000 | 276 000 |
| 41 | Пресс Кд-2322 | 19 800 000 | 1 980 000 |
| 43 | Бункер для сбора отходов древесины, инв. № 64-001 | 3 900 000 | 390 000 |
| 44 | Бункер циклон ограждения, инв. № 6Н-3 | 8 880 000 | 888 000 |
| 45 | Циклон вытяжки с виброопорами, инв. № 2-25 | 8 880 000 | 888 000 |
| 47 | Линия по производству кабельных барабанов, инв. № 1 | 605 460 000 | 60 546 000 |
| 49 | Стеллаж для хранения пиломатериалов, инв. № 217 – 243 (23 шт.) – общая стоимость | 17 838 800 | 1 783 900 |
| 50 | Транспортер ленточный, инв. № 1/19 – 1/23 | 23 220 000 | 2 322 000 |
| 53 | Электроталь 2 т, инв. № 209 | 4 140 000 | 414 000 |
| 55 | Циклон с реперами и стропами, инв. № 22-64 | 8 880 000 | 888 000 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. моб. (8029) 621 22 36.

Продавец: СООО «Барпромэкс», г. Гомель, ул. Объездная, д. 9, к. 7.

Имущество расположено по адресу: г. Гомель, ул. Объездная, 9.

Задаток перечисляется до 14 июня 2013 г. (включительно), на р/с 3012132179001 в ОАО «Банк БелВЭБ» ГРО № 530 г. Минск, МФО 153001226, УНП 490317170.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 10% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 14 июня 2013 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **17 июня 2013 года в 12.00,** г. Гомель, ул. Молодости, 5.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам:
(8 029) 621 22 36, (8 029) 684 94 62 или тел./факс 8 0232 68 25 50.**

**Дополнительная информация: www.disponent.by**



## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О СКУПКЕ АКЦИЙ

**Полное наименование и местонахождение покупателя акций:**

Новополоцкое общество с ограниченной ответственностью «Интерсервис» (Республика Беларусь, 211440, г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 7, ком. 110, контактный телефон 8 0214 37 17 67).

**Полное наименование и местонахождение брокера:**

Закрытое акционерное общество «БРОСТОК» (220036, г. Минск, переулок Домашевский, д. 11А, ком. 712-713, тел. 8 017 213 58 59).

**Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:**

Открытое акционерное общество «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга», 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, ком. № 201.

**Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель:**

486 032 (Четыреста восемьдесят шесть тысяч тридцать две) штуки.

**Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции:**
250 000 (Двести пятьдесят тысяч) рублей.

**Срок оплаты акций:**

не позднее дня, следующего за днем заключения сделки на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

**Форма и порядок оплаты акций:**

безналичное перечисление денежных средств в соответствии с правилами заключения сделок на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

**Адрес, по которому будут заключаться сделки купли-продажи:**

ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

**Дата начала скупки акций:** 1 июля 2013 года.

**Дата окончания скупки акций:** 30 декабря 2013 года.

В соответствии с решением Минского горисполкома от 13.12.2012 №3857 ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» включено в Перечень хозяйственных обществ, созданных в процессе преобразования государственных, государственных унитарных предприятий, а также арендных и коллективных (народных) предприятий, в отношении акций (долей в уставных фондах) которых Мингорисполком имеет преимущественное право на приобретение.

УНП 300577484



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению Открытого акционерного общества
«Белсвязьстрой» (продавец)
проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества в составе:**

**здание производственного корпуса,**

общей площадью **4385,0 кв.м** (инв. № 500/С-32244)
на земельном участке с кадастровым номером 500000000004000721
(предоставлен продавцу на праве постоянного пользования),
расположенном по адресу: **г. Минск, ул. Стебенева, 10 А,**
площадь земельного участка – **0,6888 га.**

На земельном участке имеются ограничения (обременения) прав в использовании:
охранная зона ливневой канализации площадью 0,1880 га,
охранная зона водопровода площадью 0,1827 га.
Объект находится в залоге (ипотеке).

При переходе к другому лицу права на имущество ипотека сохраняется.

Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 27 175 600 800 бел. руб.**

Задаток 10% от начальной цены (2 717 560 080 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

**Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **02.07.2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 01.07.2013 до 12.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**



**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.
Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Земельный участок в агрогородке Раков, переулок Пионерский, 11, площадью 0,1100 гектара** | Кадастровый номер участка 622085715608000011. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Подъездные пути, электричество, природный газ | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 2 | **Земельный участок в деревне Лесковка, уч. 31, площадью 0,1280 гектара** | Кадастровый номер участка 622085709601000034. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество. Расстояние от аг. Раков 8 километров. | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 3 | **Земельный участок в деревне Михалово, пер. Полевой № 2, 9, площадью 0,1330 гектара** | Кадастровый номер участка 622085711601000279. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Новый район застройки. Удалённость от аг. Раков 5 километров. | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 4 | **Земельный участок в деревне Кучкуны, ул. Бородинская, 59, площадью 0,1500 гектара** | Кадастровый номер участка 622085708601000284. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются электричество, водопровод. Удалённость от Ракова 4 километра | 25 000 000 | 2 500 000 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **05 июля 2013 года (пятница) в 10.00** по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 01 июля 2013 года (включительно) до 17.00** по адресу: аг. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: **(8 01772) 30 305; 8029 1405437.**

# Трагедыя Млечнага шляху

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

**Тэрыторыя сучасных Барысаўскага, Крупскага, Лагойскага, Смалявіцкага раёнаў Мінскай вобласці, а таксама Докшыцкага раёна Віцебшчыны падчас Вялікай Айчыннай вайны была зонай актыўнага партызанскага руху. Ужо з лета-восені 1941 г. тут дзейнічалі атрады «Буравеснік», «Барацьба» і інш. У 1942 г. да іх далучыліся партызанскія брыгады «Дзядзькі Колі», «Жалязняк», «Народныя мсціўцы», «Штурмавая», імя С.М. Кірава, «Смерць фашызму», атрад спецыяльнага прызначэння «Мясцовыя». Іх базы размяшчаліся ў лясах і забалочаных мясцінах ля возера Палік, па цячэнні рэк Бярэзіна, Гайна, Ілья, Бродня, Дзвінаса.**

У Плешчаніцах, Лагойску, Бягомлі, Смалявічах, Ілы, Зембіне размяшчаліся нямецкія гарнізоны. У Плешчаніцах дыслацыраваўся таксама 118-ы паліцэйскі батальён, сфарміраваны ў 1942 г. у Кіеве з палонных чырвонаармейцаў і здраднікаў, якія перайшлі на службу фашысцкай Германіі. Камандзірам гэтага батальёна быў немец маёр Кёрнер, начальнікам штаба — украінец Васюра, былы афіцэр Чырвонай Арміі. У гісторыю Беларусі гэты батальён увайшоў з-за карнай дзейнасці супраць партызанаў і мірнага насельніцтва Міншчыны, а потым і Гродзеншчыны.

Партызаны грамілі мясцовыя паліцэйскія ўчасткі, валасныя і сельскія ўправы; раздавалі людзям калгаснае збожжа, свойскую жывёлу і ўсё, што акупанты, нарабаваўшы, рыхтавалі да адпраўкі ў Германію або на ўсходні фронт. Вялі баі з асобнымі эсэсаўскімі атрадамі, разбуралі тэлефонна-тэлеграфную сувязь акупантаў, спальвалі масты, падрывалі чыгуначныя рэйкі, рабілі завалы і равы на бойкіх дарогах.

Партызанаў падтрымлівала насельніцтва: іх прымалі на пастой, давалі прытулак зімой, кармілі, пяклі для іх хлеб і ацяплялі лазні. Шмат хто з мясцовых жыхароў уступіў у партызанскі атрад.

У Барысаўска-Плешчаніцкай зоне партызаны хадзілі на баявыя заданні, у разведку, дастаўлялі ў свае шпіталі хворых і параненых, у асноўным ноччу. Удзень была вялікая верагоднасць непажаданай сустрэчы з ворагам. Групамі партызаны прабіраліся ў цемры па прасёлачных і шашэйных дарогах, па лясных сцяжынках у абход нямецкіх гарнізонаў, якімі тады густа была ўсеяна зямля Міншчыны: Барысаў, Зембін, Плешчаніцы, Лагойск... Арыентаваліся па зорках і Млечным Шляху. Таму і сваю дарогу з боку Барысава ў напрамку Лагойска назвалі Млечным шляхам. Ішоў ён па прасёлачных дарогах праз вёскі Гарадзец, Чарніца, Каменка, Чмялевічы, Селішча, Мокрадзь, Хатынь, Вялікая Губа, Казыры, Лагаза, Янушковічы і далей у Манылаўскія і Руднянскія лясы Ільянскага і сумежных раёнаў.

Было яшчэ адно адгалінаванне партызанскага Млечнага шляху. Пасля вёскі Казыры баявы партызанскі маршрут праходзіў праз вёскі Кацелі, Зарэчча, Пасадзец, Грыневічы, Крайск, Валянцінава і да Валянцінаўскага лесу, за якім у напрамку Бягомля на паляне размяшчаўся адзіны ў гэтай зоне партызанскі аэрадром. Тут садзіліся самалёты з «Вялікай зямлі»: дастаўлялі зброю, боепрыпасы, прадукты, медыкаменты, газеты, забіралі параненых і цяжка хворых партызанаў, іх дзяцей.

У канцы 1942-га—пачатку 1943 г. гітлераўцы не ведалі ад партызанаў спакою ні ўдзень, ні ўначы. З дапамогай нямецкага афіцэра Яна Далгоўскага, паляка з Кракава, партызаны выявілі паміж аўтастрадай і чыгункай Мінск — Масква падземны нямецкі высокачастотны кабель. Ян перазняў схему кабелевай трасы і з ёю прыбыў у партызанскі атрад. Па схеме дакладна вызначылі месца, дзе пралягаў кабель, выдзеўблі мерзлую зямлю і адсеклі кавалак кабеля. Яму засыпалі зямлёй, зверху паклалі міну нацiскнога дзеяння. Сувязь вермахта са штабам нямецкіх армій групы «Цэнтр» была перарвана.

Рыхтуючыся да наступлення на Курскай дузе, кіраўніцтва Германіі запатрабавала ад акупацыйных улад, эсэсаўска-паліцэйскіх фарміраванняў ведамства Гімлера, ад камандзіраў франтавых часцей вермахта знішчыць партызанаў на тэрыторыі Беларусі. Дзеля расправы з партызанскімі брыгадамі, якія дзейнічалі ў раёне возера Палік, у паўночнай частцы Мінскай вобласці і сумежных раёнах, у Мінску была створана спецыяльная група эсэсаўска-паліцэйскіх і іншых карных фарміраванняў пад кіраўніцтвам брыгадэнфюрара СС генерал-маёра паліцыі фон Готберга.

У склад гэтай групы ўвайшоў і 118-ы ўкраінскі паліцэйскі батальён пад кіраўніцтвам маёра Кёрнера, які дыслацыраваўся ў Плешчаніцах. Адна за другой запылалі тады беларускія вёскі ўздоўж партызанскага Млечнага шляху.

Першай стала акружаная з усіх бакоў лесам партызанская вёска Чмялевічы, што прыкладна ў 16 км ад Плешчаніц. 6 студзеня 1943 г. пяцёра партызанаў прыбылі ў вёску, каб правесці Каляды разам са сваімі сем'ямі. На світанку ў Чмялевічы наляцелі карнікі з Плешчаніц. Яшчэ на падыходзе да вёскі яны наткнуліся на партызанаў. Пасля перастрэлкі пачалі браць вёску ў ачапленне. Некаторыя з вяскоўцаў і партызаны паспелі ўцячы. У вёсцы засталіся толькі жанчыны з дзецьмі ды некалькі старых.

Ачапіўшы вёску, карнікі (размаўлялі яны на ўкраінска-рускай трасянцы) разышліся па хатах і пачалі выганяць людзей. Апрануцца не давалі, выганялі, хто ў чым быў. Усіх сагналі на былы калгасны двор. Ад страху і холаду дзеці і жанчыны плакалі. Пакуль некалькі карнікаў у зялёнай форме пільнавалі людзей, астатнія рабавалі маёмасць: кароў, свіней, авечак і іншае, што папалася на вочы. Нарабаванае грузілі на падводы. Потым пачалі адну за другой падпальваць сялянскія хаты. Падпалілі і хлеў ля калгаснага двара, на які сагналі людзей...

Ноччу 19 студзеня паліцаі 118-га батальёна зрабілі налёт на вёску Селішча. Забілі там 7 партызанаў. 18 лютага карнікі забілі ў Кацялях чатырох мясцовых жыхароў, якія не паспелі ўцячы, і спалілі 10 дамоў. У Зарэччы забілі 12 сялян, спалілі 30 хат.

Прасоўваючыся далей па маршруце партызанскіх разведчыкаў і баявых груп, 22 сакавіка карнікі датла спалілі вёску Хатынь. Цэлы абоз нарабаванай маёмасці адправілі ў Плешчаніцкі гарнізон.

У гэты ж дзень паліцаі затрымалі 50 сялян вёскі Казыры, якія непадалёку ад Хатыні высякалі ўздоўж Млечнага шляху лес. Іх канваіравалі ў Плешчаніцы. Пры спробе ўцёкаў 26 чалавек забілі і сямёра цяжка паранілі. Параненую 16-гадовую Насцю Шалупіну вечарам знайшоў мясцовы селянін. Пасля вайны яна расказала свету пра тую жудасную расправу.

**Дзеля расправы з партызанскімі брыгадамі, якія дзейнічалі ў раёне возера Палік, у паўночнай частцы Мінскай вобласці і сумежных раёнах, у Мінску была створана спецыяльная група эсэсаўска-паліцэйскіх і іншых карных фарміраванняў пад кіраўніцтвам брыгадэнфюрара СС генерал-маёра паліцыі фон Готберга.**

5 красавіка карнікі зрабілі аблаву на партызанаў ля вёсак Расохі і Малыя Нястанавічы. Забілі 8 мясцовых сялян, якія, убачыўшы паліцэйскіх, спрабавалі ад іх схавацца.

1—10 мая карнікі прачэсвалі Манылаўскія і Руднянскія лясы на стыку Ільянскага і Лагойскага раёнаў. Затрымлівалі і дапытвалі жанчын, якіх падазравалі ў сувязі з партызанамі. Жывым нікога не адпусцілі.

13 мая 118-ы паліцэйскі батальён пад камандаваннем Васюры праводзіў карную аперацыю супраць партызанаў у вёсцы Далькавічы былога Плешчаніцкага раёна. Пасля кароткага бою ачапілі вёску, забілі 8 партызанаў, 6 мясцовых жыхароў, спалілі 55 дамоў. Тады загінула кулямётчыца Зіна Бічун, якая вяла агонь па карніках з царкоўнай званіцы.

20—23 мая ў вёсцы Новая Вілейка карнікі спалілі 25 дамоў і кінулі ў калодзеж жанчыну, у вёсцы Вілейка ператварылі ў попел 40 дамоў і забілі 35 чалавек.

Наступнай на шляху карнікаў аказалася вёска Асавы Докшыцкага раёна (былога Бягомльскага) раёна Віцебскай вобласці. Тут часта бывалі партызаны, мясцовыя жыхары аказвалі ім дапамогу, кармілі. Не адзін з сялян пайшоў у атрад.

Жыхароў вёскі партызаны папярэдзілі аб тым, што могуць з'явіцца карнікі. Вяскоўцы з тыдзень хаваліся ў лесе. Далёка не адыходзілі — на два-тры кіламетры. Але да іх прыйшоў знаёмы з суседняй вёскі Івінск і сказаў, каб вярталіся дахаты: маўляў, ніхто іх чапаць не будзе. Людзі паверылі, вярнуліся.

27 мая раніцай паліцаі пайшлі па вясковых хатах са спісам. У ім былі партызанскія сем'і: у каго партызаніў бацька, у каго муж, у каго — дарослыя сыны. Знішчалі жанчын, дзяцей, старых. Усяго знішчылі 78 чалавек. Вяскоўцаў загналі ў гумно памерам 4х7 метраў пад саламянай страхой. Яго падпалілі, стралялі па людзях. Сярод ахвяр аказалася настаўніца Вольга Грын з трохгадовым хлопчыкам. Перад вайной яна прыехала з Магілёўскай вобласці вучыць маленькіх асаўлян. Муж яе таксама быў у партызанах.

Пасля вайны сваякі загінулых паставілі на месцы таго гумна драўляны крыж. З часам ён згніў. Месца парасло травой... Недзе ў 1970-х Бягомльскі сельсавет ушанаваў загінулых помнікам у цэнтры вёскі.

...Апошнім злачынствам 118-га батальёна на Міншчыне стала цалкам спаленая ім у канцы чэрвеня вёска Халмоўка. У ліпені 1943 г. батальён лютаваў ужо на Гродзеншчыне.

Партызанскі Млечны шлях... Ён таксама вёў да Перамогі. Дасталася яна нашаму народу цаной неверагодных пакут, крыві і папялішчаў, цаной мужнай барацьбы.

**Яўген ДАЛІДОВІЧ,**
**удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, член аператыўна-вышуковай групы па расследаванні злачынстваў, учыненых у гады нямецка-фашысцкай акупацыі карнікамі 118-га паліцэйскага батальёна,**
**Святлана МАРОЗАВА,**
**доктар гістарычных навук, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.**



**Тлумачэнні да карты «Партызанскі Млечны шлях»:**

**Зялёная «галава» ў касцы** — нямецкія гарнізоны
**Рыжая паласа** — партызанскі Млечны шлях Гарадзец — Янушковічы і яго адгалінаванне на партызанскі аэрадром
**Самалёт** — партызанскі аэрадром
**Чырвоны касцёр** — вёскі, спаленыя карнікамі. Вёскі пазначаны нумарамі
**1. Вілейка**
**2. Новая Вілейка**
**3. Асавы**
**4. Ніўкі**
**5. Халмоўка**
**6. Дралькавічы**
**7. Чмялевічы**
**8. Хатынь**
**9. Кацялі**
**10. Зарэчча**

# З ручкай і нататнікам дайшлі да ўзнагарод



**Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў штогадовага абласнога спаборніцтва сярод рэдакцый газет, арганізацый тэлебачання і радыё, журналістаў, якія працуюць на тэрыторыі Гомельскай вобласці, прайшла ў горадзе над Сожам. Спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» па Гомельскай вобласці Ірына Асташкевіч — сярод узнагароджаных. Яна атрымала ганаровую грамату Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта «За шматгадовую плённую працу ў сродках масавай інфармацыі, шматбаковае асвятленне ў друку сацыяльна-культурнага, эканамічнага развіцця Гомельскай вобласці».**

Па насычанасці мясцовымі дзяржаўнымі выданнямі ў разліку на тысячу жыхароў рэгіёна Гомельшчына з'яўляецца лідарам. Мясцовыя СМІ, безумоўна, спрыяюць фарміраванню станоўчага іміджу Гомельскай вобласці не толькі ў маштабах рэспублікі, але і за мяжой. Намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Віктар Трызно адзначыў традыцыйна высокі давер у нашай краіне да друкаванага слова, да людзей, якія маюць права паведамляць пра розныя падзеі, аналізаваць тыя ці іншыя з'явы нашага жыцця:

— Хацелася б і ў будучыні бачыць больш пазітыўных матэрыялаў пра выдатных людзей, грамадскіх дзеячаў, ганаровых грамадзян, якія сваёй працай і талентам робяць лепшымі наш горад і рэгіён, — сказаў ён.

У рэгіёне зараз працуюць больш за 120 рэдакцый СМІ, большасць з іх — друкаваныя выданні. Намеснік рэдактара аддзела рэгіянальнай інфармацыі Беларускага тэлеграфнага агенцтва Валерый Сідорчык заняў першае месца сярод журналістаў. У ліку пераможцаў сярод газет вобласці «Калінкавіцкія навіны». Першае месца сярод фотакарэспандэнтаў у фотажурналіста «Гомельскай праўды» Вячаслава Сухадольскага. Лепшай з арганізацый тэлебачання і радыё прызнана тэлерадыёкампанія «Гомель», а Аляксандр Гавейка прызнаны лепшым журналістам тэлебачання ў вобласці. Свае ўзнагароды рэгіянальным СМІ уручылі і гомельскія філіялы рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый — «Белая Русь», фонд міру, БРСМ, Чырвоны Крыж.

Ул. кар.

## Крымінал

# УГОНШЧЫКА ЗАТРЫМАЛІ ПА КРЫВАВЫХ СЛЯДАХ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага раёна сталіцы затрымалі раней неаднаразова судзімага мінчаніна, які ўгнаў аўтамабіль і спрабаваў угнаць яшчэ адзін.**

Будучы нападпітку, малады мінчанін вырашыў зладзіць для сябе начную аўтапрагулку. На нелюдзімым і неасветленым участку вуліцы Сярова мужчыне прыглянуўся мікрааўтобус «Фольксваген». Пасля няўдалых спроб узламаць дзверы нецвярозы рэцыдывіст разбіў шкло машыны камянямі, што ляжалі побач. Патрапіўшы ў салон, мужчына некалькі разоў спрабаваў завесці рухавік, але безвынікова. Тады зламыснік вырашыў паспрабаваць шчасця з другой машынай. У суседнім двары ён звярнуў увагу на неабсталяваны сігналізацыяй «Сітраен». Зноў разбіўшы шкло камянямі, угоншчык пасля некалькіх спробаў завёў легкавік. Толькі паездка аказалася нядоўгай: мужчына не справіўся з кіраваннем, і ў выніку аўто ўрэзалася ў прыпаркаваны каля ўзбочыны пасажырскі аўтобус «Неаплан», а затым зачапіла яшчэ і «Пежо». У выніку сутыкнення зламыснік атрымаў шматлікія рэзаныя траўмы твару. Выбраўшыся з машыны, ён паспяшаўся дадому. Па пакінутых крывавых слядах яго неўзабаве і адшукалі прыбыўшыя на месца здарэння апаратыўнікі Кастрычніцкага РУУС.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Павароты лёсу

# ЖЫЦЦЁ... АТРЫМАЛАСЯ!

**...Калі ў сям'і Коршакаў, жыхароў вёскі Вясея Слуцкага раёна, нарадзіўся яшчэ адзін хлопчык, пасведчанне, як водзіцца, выпісвалі ў мясцовым сельвыканкаме. На пытанне сакратара, які афармляў дакумент, пра імя нованароджанага бацька адназначна адказаў: «Слаўкам клічам ужо!» Сакратар, трохі падумаўшы, сказала: «Ну, значыць, Станіславам запішам!». Так і запісалі. Ужо потым разабраліся, што імёны Слава і Станіслаў — гэта, як той казаў, дзве вялікія розніцы. Так дагэтуль яго і клічуць: сябры і родныя — Славам, афіцыйна ж — Станіславам.**

**Усё ў жыцці Стаса Коршака ішло сваім парадкам, як у песні — па «прамым шляху». Школу скончыў у 1981 годзе. Далей жыццё прывяло яго на філфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а ў 1986-м Станіслаў атрымаў зайздроснае размеркаванне — апынуўся ў Рызе, сталіцы Латвіі, найпрыгажэйшым старадаўнім горадзе на берагах ракі Даўгавы. Выкладаў у школе рускую мову і літаратуру.**

**Пералом у жыцці здарыўся, калі ў 1997-м памерла маці. Гэтая страта настолькі ўзрушыла Станіслава, што ў яго пачаліся праблемы са здароўем: паступова сталі страчваць адчувальнасць ногі, рукі, пагаршаўся зрок...**

**Спыніць развіццё захворвання дапамог выпадак. Нейкая чуллівая бабулька прывяла ў палату да сваяка святара, які правёў сабораванне, каб умацаваць чалавека ў здароўі, духоўна падтрымаць яго. Выказаў сваё жаданне на правядзенне таінства і Станіслаў. І хваробу сапраўды атрымалася спыніць. Праўда, урачы пры выпісцы з бальніцы нічога аптымістычнага не паабяцалі. З тых часоў — з 1999 года — Стас рухаецца толькі ў інваліднай калясцы.**

**Аднаўляць сілы яму дапамагалі родныя і сябры. Аб'ехалі мноства лекараў і урачоў, выкарыстоўвалі ўсе магчымыя сродкі рэабілітацыі. Асабліва дапамагла іпатэрапія — лячэбная верхавая язда.**

**— Тое сабораванне ў бальніцы, — распавядае Станіслаў, — стала адпраўной кропкай. З'явілася гарачае жаданне жыць. Жыць абавязкова, і не проста жыць, а з задавальненнем, прыносячы людзям карысць. Бо калі штосьці аддаеш — атрымліваеш значна больш.**

Мы сустрэліся са Станіславам невыпадкова — ён прыехаў у родную вёску не як звычайна, на «пабыўку», а з сольным канцэртам, які з поспехам прайшоў 18 мая. І з задавальненнем пагутарылі.

***— Як ты прыйшоў у свет вершаў і музыкі?***

— Складаць песні, па жыццёвых мерках, я пачаў зусім нядаўна — каля 12 гадоў таму, пасля выпіскі з бальніцы. У «прыкаванага» да інваліднай каляскі процьма вольнага часу для разважанняў, у тым ліку для напісання і вершаў, і музыкі. А вершы я пачаў пісаць яшчэ студэнтам БДУ.

Потым нарадзілася ідэя выступаць з канцэртамі. Мне зусім не хацелася ляжаць у ложку і вінаваціць увесь навакольны свет у тым, што я стаў інвалідам. Мне хацелася жыць максімальна поўным жыццём. Сябры, а іх у мяне ў Латвіі нямала, ацанілі мае песні, далі станоўчую адзнаку. Яны ж дапамаглі запісаць на студыі «Antex» першыя аранжыроўкі. Справа пайшла.

***— У цябе ёсць музычная адукацыя?***

— На жаль, не, але вельмі хораша спявалі мама і тата. Маімі музычнымі «настаўнікамі» былі школьныя сябры. У дзяцінстве я нядрэнна навучыўся іграць на гітары — Лёня Карцель навучыў. Ён, дарэчы, выступіў у маім канцэрце з некалькімі песнямі — публіка была ў захапленні! У 10-м выпускным класе мы з ім і яшчэ некалькі хлопцаў арганізавалі ў школе вакальна-інструментальны ансамбль.

У тыя далёкія часы ў калгасах было нямала грошай, якія трэба было асвоіць. Будаваліся палацы культуры з мармуровым аздабленнем і разьбянымі крэсламі ў глядзельных залах, крамы, фермы, закуплялася найноўшая тэхніка. У нас у вёсцы нават фантан пабудавалі, які, дарэчы, і цяпер па святах паспяхова функцыянуе.

Нам набылі выдатную, па тых часах, апаратуру, пашылі касцюмы ў беларускім народным стылі. Ансамбль стаў выступаць на ўсіх мерапрыемствах і хутка заваяваў папулярнасць.

Ва ўніверсітэце я гэтую справу таксама не закінуў — актыўна выступаў у мастацкай самадзейнасці.

***— Але каб запісваць фанаграмы, трэба ўмець іграць на музычных інструментах?!***

— Вядома, трэба. Я нядрэнна іграю на клавішным сінтэзатары. Гэта мой пастаянны спадарожнік на ўсіх канцэртах. Гітару ў рукі даўно ўжо не бяру: з-за хваробы пальцы страцілі патрэбную адчувальнасць. Пры неабходнасці мне дапамагаюць мае дочкі, якія атрымалі музычную адукацыю, адзін з зяцёў — піяніст. Хіба ж яны могуць мне адмовіць? Для запісу складаных сольных партый запрашаем прафесійных музыкантаў. Бяруць яны з мяне нядорага (*усміхаецца*).

***— Я так разумею, што ты зарабляеш на жыццё канцэртамі?***

— Якраз і не! Усе канцэрты я даю бясплатна. Звычайна ў месяц 6—7 выступленняў у санаторыях Юрмалы (адлегласць ад Рыгі да Юрмалы — каля 25 км) і дзесьці раз у квартал у дамах састарэлых. А зарабляю я на продажы сваіх альбомаў. Для большасці адпачывальнікаў — я зусім незнаёмы артыст, але пасля канцэртаў станаўлюся «сваім», і дыскі з упадабанымі песнямі нядрэнна разыходзяцца. Часам падзарабляю на ўрачыстых мерапрыемствах у рыжскім сямейным рэстаране «Talifa».

У гэтым годзе (як, дарэчы, і летась) мяне запрасілі праспяваць у Дзень Перамогі на канцэртнай пляцоўцы побач з помнікам вызваліцелям Рыгі. Незабыўныя ўражанні ад выступлення перад 150-тысячнай аўдыторыяй на адной пляцоўцы з групай «Машына часу»!

За сваю нядоўгую музычную кар'еру я пазнаёміўся на канцэртах са шматлікімі «зоркамі» эстрады, тэатра, кіно, спартсменамі, іншымі вядомымі людзьмі. Незабыўныя ўражанні засталіся ад сустрэчы з Мікалаем Карачанцавым — чалавекам велізарнай волі і мужнасці. Пасля выканання мной песні «Ты меня на рассвете разбудишь» з рок-оперы «Юнона і Авось» кампазітара Аляксея Рыбнікава на вершы паэта Андрэя Вазнясенскага Мікалай доўга трымаў мяне за руку ў знак падзякі. Гаварыць, на жаль, ён не мог.

***— На якой мове ты спяваеш?***

— Як ты заўважыў, большасць маіх песень на рускай — ёю валодае большасць турыстаў і мясцовых жыхароў. Некалькі песень ёсць на роднай беларускай мове. Абавязкова выконваю штосьці на латышскай мове, якую я ведаю добра. Часам спяваю адну песню на некалькіх мовах: адзін куплет — на адной, другі — на іншай. Любая мова па-свойму прыгожая, асабліва калі спяваеш. Дарэчы, на канцэрты часта прыходзяць людзі, якія наогул не разумеюць ніводнага слова, — напрыклад, немцы ці латышы. Але, мабыць, адчуваюць мае песні сэрцам — потым падыходзяць, дзякуюць, бяруць аўтографы...

***— Дзе чытачы могуць пазнаёміцца з тваёй творчасцю?***

— Некалькі маіх песень выкладзена ў інтэрнэце на папулярным відэахостынгу YouTube. Дастаткова набраць маё імя і прозвішча ў пошуку. Мае песні ёсць на сайце «Спадчына Слуцкага краю» (nasledie-sluck.by). Дарэчы, настойліва рэкамендую туды зазірнуць — цікавы і пазнавальны краязнаўчы рэсурс пра гісторыю Случчыны, які ўтрымлівае мой сябар Валодзя Бойка.

***— Не думаеш вярнуцца ў родныя мясціны назаўжды?***

— Раней мне гэтае пытанне кожны раз задаваў пры сустрэчы бацька. Усё спадзяваўся, што вярнуся ў родную хату. «Кідай усё, — казаў, — прыязджай, не прападзеш!». Але куды ж я паеду? Рыга стала ўжо для мяне другой радзімай. Тут мае выхаванцы, якіх я вучыў калісьці ў школе, мае дзеці і ўнукі, мае сябры і суседзі, мая праца. Як усё гэта можна кінуць? Да таго ж як інваліду ў Латвіі мне жыць больш камфортна. Латвія, гэтак жа, як і ўсе нашы суседзі — Расія, Украіна, Літва, Эстонія, Польшча, — падпісала і ратыфікавала Канвенцыю аб правах інвалідаў. Нават не разумею, чаму Беларусь, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, засталася ўбаку.

***— А што гэта дае?***

— Ну, для гэтага лепш пачытаць першакрыніцу. Кажучы афіцыйнай мовай, галоўная мэта Канвенцыі — у заахвочванні, абароне і забеспячэнні ажыццяўлення ўсімі інвалідамі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод. Трохі «закручана», так?

Каб было больш зразумела, прывяду некалькі прыкладаў з жыцця. У мяне на грудзях вісіць звязак розных пультаў. Вось адзін — ад электрапад'ёмніка да пад'езда, другі — ад пад'ёмніка на першы паверх да ліфта. А дома яшчэ застаўся трэці — ад ложка, і чацвёрты — для прыняцця ванны. Перад домам для майго аўтамабіля — спецыяльная стаянка, якую ніхто не займае (штраф за такое свавольства — 80 долараў!). У кожнай грамадскай установе, няхай гэта будзе канцэртная зала ці вакзал, абсталяваны туалет для інвалідаў-калясачнікаў — натуральна, бясплатны.

Я атрымліваю пенсію па інваліднасці, законам вызначаны асістэнт, які павінен мяне суправаджаць за межамі кватэры 40 гадзін у тыдзень. Асобна аплачваецца праца работніка па абслугоўванні ў хатніх умовах. Я разам з суправаджальнікам бясплатна магу перасоўвацца на грамадскім транспарце, наведваю любыя мерапрыемствы таксама бясплатна. Часта бываю ў канцэртнай зале «Дзінтары» ў Юрмале. Для нас там вылучаны пастаянныя месцы. Імкнуся не прапускаць музычны фестываль КВЗ «Ківін», штогадовы міжнародны музычны конкурс «Новая хваля», фестываль гумару «Юрмала».

**Радуе і стаўленне насельніцтва да інвалідаў. Яшчэ ні разу мне не адмовілі ў дапамозе — да прыкладу, пакласці каляску ў багажнік аўтамабіля ці пераехаць праз нейкую перашкоду. Заўсёды чула і ўважліва ставяцца паліцэйскія...**

Радуе і стаўленне насельніцтва да інвалідаў. Яшчэ ні разу мне не адмовілі ў дапамозе — да прыкладу, пакласці каляску ў багажнік аўтамабіля ці пераехаць праз нейкую перашкоду, калі раптам я выехаў без свайго памочніка. Заўсёды чула і ўважліва ставяцца паліцэйскія, а чыноўнікі не палянуюцца выйсці на вуліцу, калі патрэбны, напрыклад, мой подпіс. Бо ім гэта прасцей зрабіць, чым мне дабрацца да патрэбнага кабінета.

***— Нашы людзі больш абыякавыя?***



— Ні ў якім разе! Думаю, што баланс дабра і зла ва ўсіх краінах аднолькавы. І там дрэнных людзей нямала, і тут ёсць. Але добрасардэчных, спагадных людзей мне ў жыцці сустракаецца значна больш. Напрыклад, якім чынам я ажыццявіў бы сваю мару правесці гэты творчы вечар для аднавяскоўцаў, калі б не мае сябры Валодзя Бойка, Слава Гушчын, Лёня Карцель, Міхась Крыхтоў, Андрэй Смуглій і іншыя? Яны ўзялі на сябе ўсю падрыхтоўку гэтага мерапрыемства. Мне заставалася толькі распавядаць пра сваё жыццё і спяваць. Дзякуй адміністрацыі таварыства «Вясейскі Пакроў» Дома культуры, якія з задавальненнем падтрымалі ініцыятыву!

***— Дарэчы, а чаму менавіта цяпер, а не раней вырашыў даць канцэрт?***

— Мабыць, прыйшоў час, калі ёсць што сказаць сваім землякам і праспяваць для іх.

***— І як часта ты бываеш на малой радзіме?***

— Абавязкова прыязджаю ўвесну, на Радаўніцу, наведваю магілы бацькоў, родных і блізкіх. Гэта — святое! Зазірнуць у родную школу — гэта таксама абавязкова. Асабліва парадаваў памятны знак — велізарны камень — усталяваны летась у двары школы да яе 100-годдзя. А на шыльдзе — вершы майго сябра дзяцінства Лёнькі! Праўда, з-за сціпласці ён не падпісаўся, і, магчыма яшчэ праз 100 гадоў усе будуць гадаць: чые гэта радкі?

Імкнуся праехаць па любімых месцах: Камора, Буслаўка, Мялешкі... З кожным месцам столькі звязана! Тут купаліся, тут цалаваліся — успаміны захопліваюць, як вір.

Ну, і абавязкова еду ў Мінск да сяброў са студэнцкай лавы, якія мне вельмі дапамаглі ў цяжкія гады жыцця. Гэта кандыдат навук Павел Іванавіч Навуменка; прафесар, доктар філалагічных навук Алесь Іванавіч Бельскі; старшы выкладчык філфака Аляксандр Аляксандравіч Радзевіч. Часам мы нават арганізуем «злёт» выпускнікоў. Гэта — незабыўныя радасныя сустрэчы.

*...Падчас гутаркі са Станіславам я міжволі злавіў сябе на думцы, што ён, інвалід-калясачнік, нашмат больш пазітыўна ставіцца да жыцця, чым многія здаровыя людзі.*

*Стас не ные пра свае паўсядзённыя праблемы, хоць іх, як і ў любога чалавека, таксама хапае. Яго вочы свецяцца жыццём! Ён так і напісаў на вокладцы свайго музычнага альбома «Сустракаемся ў Юрмале»: «Жыццё — цудоўнае і дзіўнае. Шануйце кожны пражыты дзень, любіце адно аднаго. Хай не азмрочваюць вас часовыя цяжкасці і няўдачы».*

*Сапраўды, як лёгка паставіць на сабе крыж і сказаць: «Жыццё не атрымалася!». Але ці трэба? Калі можна проста працягваць жыць і радавацца гэтаму жыццю... Як Стас.*

**Уладзімір ХВОРАЎ,**
**фота аўтара.**

*г. Слуцк*

# ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

**АЎТАРСКІ-18**



Для пераможцаў аўтарскага-14 Віктар Шульга, які сёлета ўзначаліў Камісію па кампазіцыі ФМЖД (**на фота**), падрыхтаваў сюрпрызы — дзве кнігі А. Кагоцькі «На шашечных перекрестках» і тры «По следам шашечной композиции». Кожны атрымае адну з іх. Мінчанін прапанаваў правесці і свой аналагічны конкурс-18. Сёння з задавальненнем пачынаем захапляльнае спаборніцтва звяздоўскіх рашальнікаў пазіцый. Лаўрэаты таксама будуць адзначаны. Усяго падрыхтавана 24 заданні — гэтым разам па рускіх шашках і міжнародных. Кожнае ацэньваецца ў адно ачко і мае заданне: выйгрыш. Вось першыя з іх:



№ 18/1. **Белыя**: 9, дамка 11(2). **Чорныя**: 4, 13, 18, 23, 34, 38(6).

№ 18/2. Белыя: a5, b4, b6, e5, g3, h2, h4(7). Чорныя: c3, d2, d4, e3, e7, f6, g7(7).

**ПЕРАМОЖНЫЯ МАНЕЎРЫ**

Адначасова працягваем конкурс «Пагода ў доме», які праводзіцца на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. І тут пашукайце манеўры гульні на карысць белых:



№ 9/17. **Белыя**: b4, b6, c5, f4, g3, h6(6). **Чорныя**: a3, b2, d2, d8, e3, e7, h4(7).

№ 9/18. **Белыя**: b2, b6, c1, c7, d6(5). **Чорныя**: a5, a7, b4, f4, g3, g5, g7(7).

№ 9/19. Белыя: a1, b6, c5, c7, d6, e7, f6, g1, h4(9). Чорныя: a3, a5, b2, c3, d4, d8, e3, f2, h2, h6(10).

❑ ❑ ❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас:

**220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

**РАШЭННІ**

**Аўтарскі-15/24** (П. Шклудаў): f4, e3, g5, ed8, e1, e7, e3!, (g1) c5, c7x.

**Аўтарскі-16** (Л. Вітошкін): **№ 16/21** — 16 (47AB) 38 (36-41) 22-28 (46) 10, 33-39, 5x. A(37) 31 (27C) 32, 46x. B(14) 22-28 (37D) 32, 46x. C(26) 21, 46x. D(32) 38 (46E) 32, 28x. E(10) 47 (46) 41, 5x і **№ 16/ 22** — 46-37 (26A) 50, 28, 37-41, 42-33, 41, 27, 37, 47#. A(27) 22-28, 37-41, 26, 28-32, 48-42, 48, 26-31, 32, 42, 38#. Заданні былі заключнымі.

## ■ А не шкодзь!

### РАКАЛОВА СУПАКОІЛІ НАРУЧНІКАМІ

**Работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі ў Капыльскім раёне на Краснаслабодскім вадасховішчы затрымалі грамадзяніна, які ў забаронены час вёў незаконную здабычу ракаў з выкарыстаннем сачка.**

— Парушальнік не выканаў патрабаванне інспектара заставацца на месцы, спрабаваў уцячы, адмаўляўся назваць сябе і прайсці да службовага аўтамабіля для разбору, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Дзяржінспектары мусілі прымяніць фізічную сілу і наручнікі. Затрыманага даставілі ў органы ўнутраных спраў для высвятлення асобы. У дачыненні да яго склалі два адміністрацыйныя пратаколы — за здабычу рыбы і іншых водных жывёл у забаронены час і за непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёй службовых паўнамоцтваў.

### ПАКІДАЛІ СЕТКІ І ЎЦЯКЛІ

**Работнікі Баранавіцкай міжрайінспекцыі атрымалі сігнал, што на колішніх торфараспрацоўках паблізу пасёлка Новы Вядзецца незаконная здабыча рыбы. Аднак калі дзяржінспектары разам з міліцыянерамі прыбылі на месца, парушальнікі паспелі збегчы.**

На беразе вадаёма былі знойдзены мяхі, пяць стаўных сетак з рыбай, агульнай даўжынёй 500 метраў, надзіманая лодка. Канфіскаваны быў і незаконны ўлоў — 30 кілаграмаў рыбы. Шкода навакольнаму асяроддзю ад дзеянняў браканьераў ацэненая ў 27,3 мільёна рублёў (273 базавыя велічыні). Асобы парушальнікаў, што ўцяклі, устанаўліваюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## «ЗАЛЁТНЫХ» МАХЛЯРОЎ ЗАТРЫМАЛІ

**Днямі наша газета паведамляла пра тое, што за тыдзень у краіне ў розных месцах — Гомелі, Жлобіне і Мінску — была здзейснена серыя аднатыпных махлярстваў. І вось стала вядома, што падазроных затрымалі.**

Нагадаем, што адзін зламыснік прапаноўваў выбранай ахвяры падзяліць быццам бы знойдзеныя долары, потым з'яўляўся другі, патрабуючы вярнуць яму згубленае. Тым часам першы перадаваў пацярпелай асобе кашалёк, маўляў, пачакайце, зараз разбяромся, але прасіў у заклад залатыя ўпрыгажэнні і іншыя каштоўныя рэчы. Пасля абодва злачынцы знікалі, а ў пакінутым кашальку ахвяра знаходзіла кавалкі паперы.

У міліцыянераў былі звесткі, што гаворка ідзе пра трох «гастралёраў» з Украіны, якія перасоўваліся па тэрыторыі нашай краіны на аўтамашыне «Шэўрале». І вось да праваахоўнікаў звярнуўся 44-гадовы мінчанін, які распавёў, што на вуліцы Алтайскай невядомыя махлярскім шляхам скралі сумку з прадуктамі харчавання і трыма залатымі ювелірнымі вырабамі. З аповеду пацярпелага стала вядома, што да аферы могуць мець дачыненне вышэйзгаданыя «гастралёры». Падазроных затрымалі па вуліцы Маякоўскага і даставілі ў Заводскі РУУС. Тут і высветлілася іх датычнасць да махлярстваў не толькі па вуліцы Алтайскай, але і ў Гомелі, Жлобіне і сталіцы, здзейсненых раней. Аднак сышчыкі мяркуюць, што гэта далёка не ўсе «подзвігі» затрыманых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



**14 июня 2013 года в 10.00 в зале Ченковского сельисполкома по адресу: п. Ченки, ул. Октябрьская, 16,**
**СОСТОИТСЯ (ПОВТОРНО) АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**
**в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| Адрес земельного участка | № участка (лота) | Площадь участка (га) | Кадастровый номер участка | Начальная цена участка (рублей) | Размер задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителями аукциона в бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Гомельская область, Гомельский район, п. Ченки:** | | | | | | |
| 1. ул. Проселочная, У-5 | 1 | 0,1230 | 321086808601000724 | 88 478 000 | 8 847 800 | 2 330 800 |

**Условия проведения аукциона:**

1. К участию в аукционе допускаются граждане РБ, подавшие в комиссию в указанные в объявлении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток. Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

2. Информация о месте размещения земельных участков, характеристик их расположения, условиях их развития можно получить по адресу: п. Ченки, Гомельский район, Гомельская область, ул. Октябрьская, 16 и тел.: 8 (0232) 96 14 59, 94 31 81, 96 11 90, 8 (029) 139 14 59.

3. Задаток в сумме 10% от начальной цены участка в белорусских рублях на р/с 3641414240030 ЦБУ 305 ф-л 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, УНП 400178309, код платежа 04901 вносится не позднее чем за три дня до даты проведения аукциона.

4. Заявления на участие в аукционе с указанием адреса и кадастрового номера земельного участка принимаются с даты публикации извещения и заканчиваются за три дня до даты проведения аукциона по адресу: п. Ченки, ул. Октябрьская, 16 Гомельского района Гомельской области.

5. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

6. **Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения, квитанцию о внесении задатка на расчетный счет;
- документ, удостоверяющий личность (паспорт), для представителей граждан — нотариально удостоверенную доверенность.

7. Местный исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до назначенной даты его проведения.

8. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате стоимости земельного участка.

9. Затраты на организацию и проведение аукциона, на изготовление документации на аукционах, расходы, связанные с опубликованием объявления, возмещаются победителем аукциона.

10. Победитель аукциона оплачивает в 10-дневный срок стоимость участка в белорусских рублях.





**ЗАВЕРЕНО:**
Заместитель директора
Департамента по ценным бумагам
Министерства финансов РБ
Лихачевский В.В.

**УТВЕРЖДЕНО**
Наблюдательным Советом
ЗАО «ИнтерПэйБанк»
30 апреля 2013 года, протокол № 12

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций ЗАО «ИнтерПэйБанк» девятого, десятого выпусков

**1. Полное наименование эмитента облигаций (на русском и белорусском языках).**

На русском языке:
полное – Закрытое акционерное общество «ИнтерПэйБанк»;
сокращенное – ЗАО «ИнтерПэйБанк».
На белорусском языке:
полное – Закрытае акцыянернае таварыства «ІнтэрПэйБанк»;
сокращенное – ЗАТ «ІнтэрПэйБанк».

**2. Дата и номер государственной регистрации эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа.**

Закрытое акционерное общество «ИнтерПэйБанк» (далее - Банк) зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.09.2001 за № 807000030.

Банк создан в соответствии с Учредительным договором от 15 января 2001 года и законодательством Республики Беларусь.

Решением Общего собрания акционеров Банка от 15 января 2007г. (Протокол № 2) наименование Банка изменено с Закрытого акционерного общества «Северный Инвестиционный Банк» на Закрытое акционерное общество «Кредэксбанк».

Решением Общего собрания акционеров Банка от 28 декабря 2012 г. (Протокол № 6) наименование Банка изменено с Закрытого акционерного общества «Кредэксбанк» на Закрытое акционерное общество «ИнтерПэйБанк».

**3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail).**

Юридический и почтовый адрес: 220068, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Некрасова, дом 114.
Адрес в интернете: www.ipaybank.by
тел./факс (017)388-50-70/388-50-12
электронный адрес: mail@ipaybank.by.

**4. Сумма зарегистрированного уставного фонда.**

Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 150 393 985 500 (сто пятьдесят миллиардов триста девяносто три миллиона девятьсот восемьдесят пять тысяч пятьсот) белорусских рублей.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации.**

Периодическое печатное издание – газета «Звязда».

Сроки опубликования – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

В случае принятия в отношении ЗАО «ИнтерПэйБанк» решения о реорганизации или ликвидации, либо в случае возбуждения в отношении банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), соответствующая информация будет опубликована в периодическом печатном издании в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

Информация об изменениях, внесенных в настоящий проспект эмиссии, будет опубликована в том же периодическом печатном издании, в котором ранее была опубликована краткая информация об открытой продаже облигаций девятого и десятого выпусков в соответствии с настоящим проспектом эмиссии, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

**6. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии).**

Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в ЗАО «ИнтерПэйБанк» по адресу: г. Минск, улица Некрасова, дом 114 с 9:00 до 13:00 и с 13:50 до 16:00,
- на сайте www.ipaybank.by.

**7. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о девятом, десятом выпусках облигаций утверждено 16.04.2013 года (протокол № 10) Наблюдательным советом ЗАО «ИнтерПэйБанк».

**8. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**

Денежные средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, будут зачисляться на балансовые счета 4940 в ЗАО «ИнтерПэйБанк», г. Минск, код 273, УНП 807000030.

**9. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, (далее – депозитарий эмитента) его место нахождения, дата и номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**

Эмитента обслуживает депозитарий ЗАО «Агрокапитал», расположенный по адресу: 220030, г. Минск, ул. Революционная, дом 6 В, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1097 от 29.07.2007, выданного Министерством финансов Республики Беларусь; лицензия продлена на основании решения от 29.06.2012 года №196 сроком на десять лет и действительна до 29.07.2022.

ЗАО «Агрокапитал» зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь 18 августа 2000 года, регистрационный номер №931.

**10. Цель выпуска облигаций.**

Привлечение свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы Банка. Средства, полученные от размещения облигаций, будут направлены на выполнение целей и задач, предусмотренных Уставом ЗАО «ИнтерПэйБанк».

**11. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**

Облигации размещаются путем открытой продажи юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь.

Дата начала продажи – 04 июня 2013 года.

Дата окончания продажи – 04 июня 2014 года.

Период обращения облигаций – с 04 июня 2013 года по 04 ноября 2014 года (518 дней).

Открытая продажа облигаций осуществляется:

- на внебиржевом рынке по адресу: 220068, г. Минск, ул. Некрасова,114 ежедневно в течение банковского дня на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

Дисконтные облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости. Цена продажи одной облигации устанавливается ежедневно.

Юридические лица и индивидуальные предприниматели, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором первичного размещения облигаций.

Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

При расчете количества дней срока обращения (до погашения) день открытой продажи и день погашения облигаций считаются одним днем.

**12. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций, срок обращения, период проведения открытой продажи облигаций, дата погашения облигаций.**

| Параметры | 9 выпуск |
|---|---|
| Форма и вид облигаций | Именные, дисконтные, в бездокументарной форме |
| Валюта | Белорусский рубль |
| Объем эмиссии | 50 000 000 000 (Пятьдесят миллиардов) |
| Количество облигаций (шт.) | 500 000 (Пятьсот тысяч) штук |
| Серия, номера облигаций | ИП09 000001-500000 |
| Номинальная стоимость | 100 000 (Сто тысяч) |
| Дата начала продажи | 04 июня 2013 года |
| Дата окончания продажи | 04 июня 2014 года |
| Срок обращения облигаций | с 04 июня 2013 года 04 ноября 2014 года (518 дней) |
| Дата погашения | 04 ноября 2014 года |
| **Параметры** | **10 выпуск** |
| Форма и вид облигаций | Именные, дисконтные, в бездокументарной форме |
| Валюта | Доллар США |
| Объем эмиссии | 1 000 000 (Один миллион) |
| Количество облигаций (шт.) | 1 000 (Одна тысяча) штук |
| Серия, номера облигаций | ИП10 0001-1000 |
| Номинальная стоимость | 1 000 (Одна тысяча) |
| Дата начала продажи | 04 июня 2013 года |
| Дата окончания продажи | 04 июня 2014 года |
| Срок обращения облигаций | с 04 июня 2013 года 04 ноября 2014 года (518 дней) |
| Дата погашения | 04 ноября 2014 года |

**13. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, и порядок его определения.**

Доходность по облигациям **девятого** выпуска – 20 (Двадцать)% годовых при размещении по цене, установленной в первый день продажи.

Цена продажи облигаций девятого выпуска на первичном рынке в первый день составляет 77892 (Семьдесят семь тысяч восемьсот девяносто два) белорусских рубля (минимальная цена продажи). Начиная со дня, следующего за датой начала продажи, и в течение всего периода проведения открытой продажи (размещения) покупатель приобретает облигации по цене, которая обеспечивает ему доходность в размере 20% годовых на дату начала погашения.

Доходность по облигациям **десятого** выпуска – 6 (Шесть)% годовых при размещении по цене, установленной в первый день продажи.

Цена продажи облигаций десятого выпуска на первичном рынке в первый день составляет 921,53 (Девятьсот двадцать один доллар США 53 цента) (минимальная цена продажи). Начиная со дня, следующего за датой начала продажи, и в течение всего периода проведения открытой продажи (размещения) покупатель приобретает облигации по цене, которая обеспечивает ему доходность в размере 6% годовых на дату начала погашения.

Доход по облигациям (дисконт) – разница между номинальной стоимостью облигации и фактической ценой ее продажи.

При расчете доход начисляется за каждый календарный день года.

Выплата дохода осуществляется единовременно при погашении облигаций.

*Доходность по дисконтным облигациям рассчитывается по следующей формуле:*

$$П = \frac{(Н - Ц) \times 100}{Ц} / (\frac{T365}{365} + \frac{T366}{366}),$$

где:
*П* – доходность по дисконтным облигациям (процентов годовых);
*Н* – номинальная стоимость дисконтных облигаций;
*Ц* – цена продажи дисконтных облигаций;
*Т365* – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
*Т366* – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Количество дней до погашения облигаций определяется со дня их продажи по день погашения. При этом день продажи и день погашения считаются одним днем.

*Цена продажи дисконтной облигации рассчитывается по формуле*:

$$Ц = \frac{100 \times Н}{П \times (T365/365 + T366/366) + 100},$$

где:
Ц – цена продажи дисконтной облигации;
*Н* – номинальная стоимость дисконтных облигаций;
*П* – доходность по дисконтным облигациям (процентов годовых);
*Т365* – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
*Т366* – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Текущая стоимость дисконтных облигаций рассчитывается по формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times П}{100} \times (\frac{T365}{365} + \frac{T366}{366}),$$

где:
С - текущая стоимость дисконтных облигаций;
Ц - цена дисконтных облигаций, определенная эмитентом в первый день продажи;
П – доходность, рассчитанная исходя из цены продажи на дату начала размещения облигаций (процентов годовых), установленная эмитентом;
Т365 – количество дней обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
*Т366* – количество дней обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

При определении текущей стоимости и цены продажи облигации, расчет дохода производится по каждой облигации:

**девятого** выпуска – с точностью до одного рубля,

**десятого** выпуска – с точностью до двух знаков после запятой с округлением в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Расчет цены продажи и текущей стоимости облигаций осуществляется исходя из фактического количества дней в году.

При расчете количества дней срока обращения (до погашения) и периода начисления дохода первый и последний дни срока (периода) считаются одним днем. При этом, если срок (период) делится переходом с календарного года, состоящего из 365 дней, на календарный год, состоящий из 366 дней, либо наоборот, то при определении значений Т365 и Т366 уменьшается количество дней в первой части периода независимо от количества дней в календарном году.

Облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости и погашаются по номинальной стоимости.

Выплата дохода по облигациям осуществляется одновременно с погашением облигаций.

**14. Условия и порядок досрочного погашения выпуска облигаций.**

Эмитент вправе принять решение о досрочном погашении облигаций либо его части до даты окончания срока обращения:

- неразмещенных эмитентом облигаций (в полном объеме эмиссии либо его части) на момент принятия соответствующего решения;
- приобретенных эмитентом облигаций (в полном объеме эмиссии либо его части) до даты окончания срока обращения.

Решение о досрочном погашении облигаций девятого, десятого выпуска принимается Наблюдательным Советом ЗАО «ИнтерПэйБанк».

**15. Порядок погашения облигаций.**

Погашение облигаций производится по адресу: 220068, г. Минск, ул. Некрасова, 114 ЗАО «ИнтерПэйБанк» с 09-00 до 16-00 в рабочие дни, начиная с даты погашения.

Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в сформированном реестре владельцев облигаций, путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения и не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельцев облигаций денежных средств, осуществить перевод погашаемых облигаций на счет «депо» ЗАО «ИнтерПэйБанк» № 1000580 в депозитарии ЗАО «Агрокапитал», код D01.

В день погашения облигаций эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. При погашении облигаций владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете эмитента до непосредственного обращения к эмитенту владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**16. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций.**

Реестр владельцев облигаций с целью их погашения формируется за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.

**17. Срок возврата средств при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.**

При запрещении выпуска ценных бумаг эмитент в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении выпуска ценных бумаг возвращает инвесторам средства, полученные в оплату размещенных ценных бумаг, а также накопленный доход, и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

**18. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала погашения облигаций с возможностью их последующего обращения.**

В период обращения облигаций эмитент может осуществлять приобретение (выкуп) облигаций у любого их владельца в сроки и по цене, установленные соглашением между владельцем облигаций и эмитентом.

Для продажи облигаций эмитенту до даты начала погашения облигаций владелец облигаций обращается в банк в письменной форме путем предоставления заявления, подписанного уполномоченным сотрудником владельца облигаций, с указанием полного наименования владельца облигаций, места нахождения и контактных телефонов, номера выпуска и количества продаваемых облигаций, а также наименования профессионального участника рынка ценных бумаг, от имени которого будет осуществляться продажа облигаций в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (только для продажи облигаций на биржевом рынке) не позднее, чем за 5 (пять) рабочих дней до предполагаемой даты продажи облигаций эмитенту.

Эмитент рассматривает поступившее от владельца облигаций обращение в течение 3 (трех) рабочих дней и сообщает владельцу о принятом уполномоченным органом эмитента решении. При принятии эмитентом положительного решения, приобретение облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигаций и эмитентом, и/или на биржевом рынке в соответствии с правилами ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Эмитент имеет право совершать следующие операции с выкупленными облигациями:

- продавать на вторичном рынке по договорной цене;
- досрочно погашать;
- совершать иные операции, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

**19. Информация о порядке конвертации облигаций данного выпуска в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения.**

Конвертация облигаций не производится.

**20. Основания, по которым выпуск бездокументарных облигаций может быть признан несостоявшимся.**

Эмитентом не устанавливаются основания признания данных выпусков не состоявшимися.

**21. Условия обеспеченности займа.**

Облигации выпускаются в соответствии с п.1.8. Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28.04.2006 г. «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала.

Выпуск согласован с НБ РБ 26.04.2013 письмо №15-16/42.

**22. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**

Облигации **девятого** выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь № 5-200-02-1902 от «24» мая 2013 года.

Облигации **десятого** выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь № 5-200-02-1903 от «24» мая 2013 года.

**И.о. Генерального директора** **В.В. Кашко**

**Главный бухгалтер** **Л.А. Болотина**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь
на осуществление банковской деятельности № 19 от 18 января 2013 года. УНП 807000030

# Сушкоў «на Zabore»

**Тое, што звычайна пішуць на плоце, вядома, выклікае абурэнне грамадзян і стварае праблему для службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Альтэрнатывай можа стаць сучаснае мастацтва, якое пры гэтым набывае дадатковую творчую пляцоўку.**

Рэпрадукцыі карцін гомельскага мастака Аляксандра Сушкова цяпер размешчаны на металічнай агароджы цэнтральнага гомельскага парку. Дарэчы, гэтаму папярэднічала выстава, на якой у выставачнай зале галерэі імя Гаўрыіла Вашчанкі прэзентаваліся палотны чатырох гомельскіх мастакоў: Віталя Дзенісенкі, Святланы Наздрын-Платніцкай, Івана Папова і Аляксандра Сушкова. Чатыры мастакі прадставілі розныя тэндэнцыі і стылі сучаснага мастацтва: ад сімвалічнага рэалізму і абстрактнага жывапісу — да сюррэалізму з элементамі фэнтэзі.

Арганізатар — інвестыцыйная кампанія «Зубр Капітал» пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі выбралі для дэманстрацыі на агароджы творы Аляксандра Сушкова, які мае нетрывіяльнае бачанне, часта выкарыстоўвае нечаканыя рашэнні для сваіх работ, іранізуе, нават гуляе з гледачом. Ірына Кандраценка, куратар арт-праекта Zabor, гаворыць, што яго мэта галоўным чынам асветніцкая, бо беларусы часта не ведаюць сваіх мастакоў у твар. Задача праекта — зрабіць вядомай творчасць сучасных айчынных жывапісцаў.



Гомель стаў трэцім горадам у арт-праекце Zabor. Летась у ліпені праект стартаваў у Мінску на агароджы парку Чалюскінцаў, а ў сакавіку адкрыўся ў Віцебску на агароджы батанічнага саду. Рэпрадукцыі палотнаў чатырох беларускіх мастакоў — Руслана Вашкевіча, Сяргея Каваля, Уладзіслава Стальмахова і Віктара Альшэўскага — асноўная экспазіцыя, якая пераязджае з горада ў горад. У кожным з абласных цэнтраў да абраных далучаецца яшчэ адзін мастак. Аляксандр Сушкоў, між іншым, як і іншыя, не рыхтаваў свае работы менавіта да ўдзелу ў гэтым праекце.



Экспазіцыя на гомельскай агароджы будзе радаваць наведвальнікаў гомельскага парку да ліпеня. Наступным горадам, дзе агароджы набудуць непаўторны твар, стане Магілёў. Ну а налета падвесці вынікі арт-праекта арганізатары абяцаюць вялікай экспазіцыяй арыгіналаў усіх работ у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

■ МатывАкцыя

# КНІГІ «КАТАЛІСЯ» Ў МЕТРО



**«Чытаць не шкодна, шкодна не чытаць»... «Няма нічога смачнейшага за кнігу»... «Чытанне — прычына фарміравання ўласнага пункту гледжання»... З гэтымі і іншымі выслоўямі напрыканцы мінулага тыдня ў мінскае метро прыйшлі ўдзельнікі моладзёвага флэшмобу «Чытанне ў вялікім горадзе».**

Удзельнікам акцыі, прымеркаванай да Дня славянскага пісьменства, папярэдне раздалі кнігі ў спецыяльных вокладках, на якіх і былі змешчаны вышэйзгаданыя «матыватары чытання». Юнакі і дзяўчаты заходзілі ў вагон і разыходзіліся па ўсёй яго даўжыні, а пасля ўсе разам даставалі кнігі і дэманстратыўна іх разгортвалі. Пасажыры на працягу некалькіх хвілін, пакуль цягнік рухаўся да наступнай станцыі, мелі магчымасць разгледзець і ацаніць крэатыўныя вокладкі.

На працягу дзвюх гадзін удзельнікі флэшмобу, якіх, дарэчы, было 40 чалавек, праехалі па большасці станцый, кожны раз змяняючы вагон. Па інфармацыі прэс-службы арганізатараў акцыі, моладзевага грамадскага аб'яднання «Ніка», пасажыры метро рэагавалі на флэшмобераў па-рознаму: хтосьці апладзіраваў, даставаў сваю кнігу і далучаўся да чытання, іншыя фатаграфавалі акцыю на тэлефон і проста ўсміхаліся.

Працягам флэшмобу стаў пошук у горадзе прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва з кнігамі ў руках. Усім сустрэчным паненкам, якія адпавядалі гэтаму параметру, прэзентавалі кветку. Арганізатары адзначаюць, што адчулі станоўчую рэакцыю на сваю дзейнасць, таму ўлетку плануюць правесці яшчэ адзін «чытацкі» флэшмоб.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Факт

## ФІЗКУЛЬТУРАЙ ЗАЙМАЙСЯ І АЗДАРАЎЛЯЙСЯ

**З ходам будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу (ФАК) у Стоўбцах азнаёміўся губернатар Міншчыны Барыс Батура падчас выязнога пасяджэння Мінаблвыканкама па развіцці будаўнічага комплексу цэнтральнага рэгіёна.**

Комплекс, куды ўвойдзе спартыўная, трэнажорная залы, залы барацьбы і аэробікі, плавальны басейн даўжынёй 25 метраў, буфет, мяркуецца, прыме першых наведвальнікаў у верасні. Напачатку планавалася ўвесці яго ў эксплуатацыю ў снежні, але губернатар даў даручэнне скараціць тэрміны будаўніцтва, а таксама павялічыць колькасць месцаў на трыбунах для гледачоў з 390 да 1 тысячы. Агульная плошча ФАКа 6 тыс. кв. м. На яго ўзвядзенні ўжо асвоена 29 млрд рублёў, для завяршэння работ неабходна яшчэ 48 мільярдаў.

Сёлета фізкультурна-аздараўленчыя комплексы з'явяцца ў Чэрвені, Беразіно, Уздзе — сталіцы сёлетніх абласных «Дажынак».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## І ЗНОЎ «ЗАМІНІРАВАЎ»

**У Віцебску а 12 гадзіне ночы ў міліцыю патэлефанаваў мужчына і паведаміў, што ў жылым доме па вуліцы Жасткова, якая знаходзіцца ля плошчы Перамогі, закладзена выбуховае прыстасаванне.**

Сапёры так нічога і не знайшлі. Было ўстаноўлена, што «пажартаваў», знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, мясцовы жыхар, 1987 года нараджэння. Дарэчы, ён быў раней судзімы за таксама лжывае паведамленне аб небяспецы. «Мінёр» затрыманы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Інфарм-укол

# СВЯРБІЦЬ-СМЫЛІЦЬ? ГЭТА ГРЫБЫ

**Пры шэрагу парушэнняў работы ўнутраных органаў аслабляецца і ахоўная функцыя скуры. Грыбы шырока распаўсюджаны ў прыродзе. Аднак толькі невялікая іх частка можа выклікаць адпаведныя захворванні ў чалавека і жывёл. Найчасцей паразітычныя грыбы пашкоджваюць скуру, валасы і пазногці. Заражэнне адбываецца ад хворага чалавека, жывёлы або праз рэчы, якімі карысталіся хворыя. На распаўсюджанасць грыбковых захворванняў уплывае, дарэчы, вельмі шмат момантаў — ад клімату і глебы канкрэтнай мясцовасці да наяўнасці значнай колькасці бяздомных кошак і сабак. Нягледзячы на разнастайнасць грыбоў, распазнаць іх шкоднае ўздзеянне на чалавека можна па наяўнасці пачырванення скуры, свербе, смыленні, кажа валеолаг 23-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ.**

**Рознакаляровы лішай.** Церпіць самы паверхневы слой скуры. Плямы правільнай, акруглай формы, рознага памеру, жоўтага або светла-карычневага адцення. Пры патлівасці дробныя плямы могуць зліваецца і ператварацца ў вялікія. Пасля знаходжання на сонцы яны святлеюць. Ультрафіялетавыя промні часткова вылечваюць ад гэтага захворвання.

***Лячэнне.*** *Выкарыстоўваюць прэпараты з супрацьгрыбковымі антыбіётыкамі (мазі, растворы). Важную ролю адыгрывае абеззаражванне бялізны, мачалак, ручнікоў.*

**Мікраспарыя, трыхафіцыя.** Пашкоджвае скуру, валасы, часам пазногці. Плямы правільнай формы, чырвонага колеру з ацёчнасцю, дакладна акрэсленыя. Праз некалькі дзён пачынаюць лупіцца, і ў гэтых лупінах знаходзіцца вялікая колькасць грыбоў. Падчас купання заразны «матэрыял» можа разносіцца на іншыя ўчасткі скуры. Калі ачагі з'яўляюцца на валасістай частцы галавы, валасы абламваюцца на вышыні 0,5-1 см (стрыгучы лішай). Крыніцай заражэння ў асноўным з'яўляюцца кацяняты, шчанюкі, марскія свінкі, хамякі, з якімі гуляюць дзеці. І хварэюць, дарэчы, у асноўным, дзеці.

***Лячэнне.*** *Працяглае мясцовае прымяненне супрацьгрыбковых прэпаратаў, якія прыгнятаюць размнажэнне грыбоў. Пры пашкоджанні валасоў хвораму прызначаюць супрацьгрыбковыя антыбіётыкі ўнутр. Вядзецца сістэматычнае назіранне крыві, мачы з-за таксічнага ўздзеяння антыбіётыкаў. У памяшканні, дзе знаходзіцца хворы, праводзіцца дэзынфекцыя.*

**Грыбковыя захворванні з пашкоджаннем ступняў і пазногцяў.** Спачатку праяўляецца лушчэннем на скуры падэшваў, паміж пальцамі. Паступова пазногці становяцца ломкімі, жаўтаватага колеру, часам патаўшчаюцца.

***Лячэнне.*** *Працяглае і праводзіцца пад сістэматычным наглядам урача-дэрматолага, які будзе ўлічваць стан арганізма ў цэлым, наяўнасць хранічных хвароб.*

**Кандыдоз.** Запаленчы працэс, які выклікаюць кандыды — разнавіднасць грыбкоў, што пашкоджваюць скуру, слізістыя, пазногці, а часам і ўнутраныя органы. Развіццю кандыдозаў спрыяюць траўмы слізістых і скуры, павышаная вільготнасць, уздзеянне на скуру кіслот і шчолачаў, частае і працяглае ўжыванне антыбіётыкаў, гіпавітаміноз, дыябет, атлусценне, павышаная патлівасць, парушэнне кровазвароту ў канечнасцях і інш. Найчасцей кандыдоз «пасяляецца» ў складках скуры, пад ягадзіцамі, грудзямі, паміж пальцамі рук і ног. Скура робіцца малінавай, а паверхневы слой яе мокне. З'яўляецца сверб. Пазногці мяняюць колер.

***Лячэнне.*** *Прымяняюцца розныя методыкі, аднак яно абавязкова павінна быць комплексным. Каб улічваць не толькі самі грыбы, але і прычыны, што прывялі да развіцця кандыдозу. Такі пацыент абследуецца і ў іншых спецыялістаў — тэрапеўта, эндакрынолага, сасудзістага хірурга, стаматолага. Праводзіцца лабараторнае даследаванне ў мікалагічнай лабараторыі для выяўлення разнавіднасці грыбоў, а таксама разавыя даследаванні мачы, крыві. Пасля курсаў лячэння — лабараторнае даследаванне на наяўнасць грыбоў з ачагоў паражэння.*

**Як пазбегнуць грыбковых захворванняў?**

- ✓Вытрымліваць індывідуальныя меры бяспекі (не карыстацца чужой бялізнай, тапачкамі, шкарпэткамі, расчоскамі, зубнымі шчоткамі; любыя, нават невялікія траўмы апрацоўваць дэзынфікуючымі сродкамі).
- ✓Памятаць пра засцярогу ў саўнах, лазнях, басейнах, на пляжы.
- ✓Па магчымасці штодня прымаць душ, мыць ногі халаднаватай вадой.
- ✓Не насіць вузкага, малога абутку, а таксама абутку, які выклікае пастаянную патлівасць ступняў.
- ✓Патрабаваць у манікюрных, педыкюрных кабінетах належнай дэзынфекцыі.
- ✓Не прыносіць дадому жывёл да агляду ў ветэрынара.
- ✓Тлумачыць дзецям пра небяспеку кантактаў з неабследаванымі жывёламі.
- ✓Раз на год здаваць агульны аналіз крыві, мачы.
- ✓Пры наяўнасці любой паталогіі на скуры тэрмінова звяртацца да дэрматолага.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень міратворцаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.***

**1453** год — пасля трохдзённага штурму турэцкае войска султана Мехмеда II Заваёўніка захапіла сталіцу Візантыі Канстанцінопаль. Так быў пакладзены канец 1100-гадовай гісторыі хрысціянскай Візантыйскай імперыі. Яе апошні імператар Канстанцін XI Палеолаг (дзядзька Соф'і Палеолаг, бабкі Івана Грознага) загінуў, гераічна змагаючыся ў радах абаронцаў горада. Яго апазналі ў велізарнай гары загінулых па маленькіх залатых двухгаловых арлах на пурпуровых саф'янавых ботах. Султан загадаў пахаваць імператара з належнай пашанай. У захопленым Канстанцінопалі пачаліся рабаванні і забойствы; больш за 60 тысяч чалавек былі ўзяты ў палон. Апошнія рэшткі некалі вялікай імперыі — Марэя і Трапезунд — трапілі пад турэцкае валадарства ў 1460-м і 1461 гадах адпаведна. Асманская імперыя рушыла на Еўропу.



**1585** год — адкрыўся Полацкі школьны тэатр. Існаваў ён пры полацкім езуіцкім калегіуме ажно да 1819 года. У рэпертуары тэатра пераважалі драмы на рэлігійныя, міфалагічныя і гістарычныя сюжэты. Яны ставіліся пераважна на лацінскай, зрэдку на польскай, часам на беларускай мовах. Паказы былі прымеркаваны да Масленіцы, іншых народных святаў, да летніх вакацый і да завяршэння навучальнага года. Аўтарамі пастановак былі выкладчыкі калегіума. Сярод спектакляў: «Вясёлае пасля хмар сонца», «Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба», «Крушэнне карабля на сушы» і іншыя.

**1932** год — нарадзіўся Юрый Панцеляймонавіч Грыгор'еў, заслужаны архітэктар Беларусі (1976), заслужаны архітэктар Расіі (1993). У 1974-86 гадах — намеснік старшыні Дзяржбуда Беларусі, галоўны архітэктар Мінска. Асноўныя працы: генпланы многіх буйных прамысловых аб'ектаў у гарадах Беларусі, у Мінску — інстытуты тэхнічнай кібернетыкі і электронікі НАН Беларусі, крыты каток у парку імя М. Горкага, Дом літаратара і іншыя. У 1973-75 гадах быў старшынёй праўлення Саюза архітэктараў Беларусі.

### Было сказана

**Максім ЛУЖАНІН (1909-2001), паэт, празаік, кінадраматург, перакладчык:**

*«Суджана, стаўлена пад перакладзіны,*
*Сечана, палена, а не аддадзена,*
*Не парастрачана і не раскрадзена,*
*Рупна ў падмуркі на золку пакладзена*
*Роднае слова».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Квінтэт. Секстэт. Грубка. Молат. Сурма. Аза. Чабор. Трыа. Квартэт. Эра. Абзац. Макі. Тура. Бак. Галета. Джада. Шок. Кар. Палын. Экран. Ніт. Нафта. Альпака. Енк. Дуда. Атон. Бондар. Калымага.

**Па вертыкалі:** Якут. Дуэт. Стаер. Абакан. Рота. Адана. Туга. Ікар. Мачта. Тэндар. Трумо. Кут. Лабаз. Док. Секта. Астана. Тарац. Пол. Ваза. Атам. Алешына. Цырк. Тонік. Ірак. Талерка.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.47 | 21.27 | 16.40 |
| Віцебск | — 4.30 | 21.24 | 16.54 |
| Магілёў | — 4.37 | 21.17 | 16.40 |
| Гомель | — 4.43 | 21.05 | 16.22 |
| Гродна | — 5.04 | 21.41 | 16.37 |
| Брэст | — 5.13 | 21.33 | 16.20 |

**Месяц**

***Поўня 25 мая.***
***Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Дзмітрыя, Ісая, Макара, Пахома.*
***К.*** *Інгі, Эміліі, Аўгусціна, Вільгельма, Германа, Яраміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**А вы заўважылі, што пасля таго, як у расійскай дзярждуме з'явіўся Валуеў, Жырыноўскі перастаў там біцца?..**

— У цябе ёсць ідэал жанчыны?
— Быў...
— Чаму «быў»? Ён што, памёр?
— Горш — я з ім ажаніўся...

**Людзі! Не стрыжыцеся ў Зверава. Ён потым на гэтыя грошы песні запісвае!**

З тлумачальнай дворніка.

«Я зусім не быў п'яны ў пятніцу. А ляжаў на газоне і еў траву, таму што зламалася каса — план жа трэба было выконваць любой цаной».




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 24.357. Індэкс 63850. Зак. № 2299.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 28 мая 2013 года.